
*Цыганы* ☞ 3

# Ніва

**ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ**

*ЯН ПЯТРОЎСКІ* ☞ 9



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

**№ 1 (2538)** **Год L** **Беласток, 2 студзеня 2005 г.** **Цана 2,00 зл.**


*Рашэнне аб выкрасленні са спісу палітычных партый Беларускага дэмакратычнага аб'яднання — адзінай палітычнай партыі ў Польшчы, якая дзейнічае ад 1990 года, было вырашана ў лютым 2004...*

## Далоў беларускую партыю

Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне па заяве Дзяржаўнай выбарчай камісіі (ДВК), выкраслілі з рэгістра палітычных партый. Рашыў гэтак Акругowы суд у Варшаве.

— Гэта нязгодна з Канстытуцыяй ды звышінтэрпрэтаванне навелізаванага закону аб палітычных партыях, заканадаўчай недаробкі, — заяўляюць дзеячы партыі, якія адклікаліся ад гэтага рашэння.

Рашэнне аб выкрасленні са спісу палітычных партый Беларускага дэмакратычнага аб'яднання (БДА) — адзінай палітычнай партыі ў Польшчы, якая дзейнічае ад 1990 года, было вырашана ў лютым 2004 г. Акруговым судом у Варшаве. Падставай рашэння быў факт непадання членамі партыі справаздачы са сваёй фінансавай дзейнасці і прыбытках. Справаздача, пададзеная ў папярэднім годзе, была адкінута ДВК як невыконваючае фармальных патрабаванняў. Абвінавацілі тады партыю, што няма ў яе банкаўскага рахунку, а калі так, дык нельга прызнаць правільным вядзенне ёю фінансавых спраў. ДВК, аднак, у 2002 г. мела ў распараджэнні адказ БДА, што тая рахунку не мае, да таго не вядзе гаспадарчай дзейнасці. Незалежна ад таго (адсутнасць рахунку, гаспадарчай дзейнасці), згодна з навелізаваным законам аб палітычных партыях неабходна — што здаецца быць кур'ёзным — падаваць г.зв. адмоўныя фінансавыя справаздачы (да 31 сакавіка кожнага года), значыць, аб тым, што не вядзецца гаспадарчая дзейнасць.

— Гэта пытанне чыста фармальнае, якое вынікае са знавелізаванага закону аб палітычных партыях ад 1997 г. Папярэдні закон не забавязваў падаваць справаздачы, калі партыя не вяла ніякай гаспадарчай дзейнасці, — тлумачыць Пятро Юшчук, адзін з заснавальнікаў БДА, юрыст.

Артыкул 38 закону ў сённяшнім выглядзе кажа, што палітычная партыя падае справаздачы з інфармацыяй аб крыніцах здабывання грошай, сярод гэтага аб банкаўскіх крэдытах, а таксама аб факце, што засноўвае Выбарчы фонд і ці на гэту мэту былі нейкія ўзносы ды падае адпаведны разлік. Палітычная партыя, якая не вядзе гаспадарчай дзейнасці, а падставай яе існавання з'яўляецца валоданне банкаўскім рахункам, такога абавязку не мае. Прынамсі закон гэтага не загадвае.


*Другі Кангрэс Беларускага дэмакратычнага аб'яднання*

— Інтэрпрэтацыі паддаецца той 38 артыкул. Ці палітычная партыя, якая паведаміла ДВК аб тым, што не вядзе гаспадарчай дзейнасці, а банкаўскі рахунак мае, абавязана падаваць адмоўныя справаздачы? Мы лічым, згодна з літаральным запісам таго артыкула, што павінна мець рахунак і падаваць справаздачу такая партыя, якая вядзе гаспадарчую дзейнасць. Калі ёсць наадварот, то не абавязана таго рабіць, пакуль не пачне такой дзейнасці. Той артыкул не дапускае падаванне адмоўных справаздач. ДВК, значыць, не павінна была заяўляць аб выкрасленні партыі з рэгістра палітычных партый. Такія дзеянні парушаюць запісы Канстытуцыі, — тлумачыць Пятро Юшчук.

Згодна з 11 артыкулам Канстытуцыі — „Рэч Паспалітая гарантуе свабоду стварэння і дзейнасці палітычных партый...". Наступны артыкул кажа, у якіх канкрэтна выпадках партыі ў Польшчы нельга весці дзейнасць: „Забараняецца існаванне палітычных партый і іншых арганізацый, якія спасылаюцца ў сваіх праграмах на таталітарныя метады і практыкі дзеяння нацызму, фашызму і камунізму, а таксама тых, якіх праграма альбо дзейнасць прадугледжваюць ці дапускаюць расавую ці нацыянальную нянавісць, прымяненне гвалту з мэтай здабыцця ўлады ці ўплыву на палітыку дзяржавы альбо прадбачвае засакрэчанне структур ці членства".

— Выкрасленне палітычнай партыі з рэгістра, значыць, яе ліквідацыя, можа наступіць тады, калі вядзе яна дзейнасць нязгодную з мерытычнымі юрыдычнымі нормамі, а не фармальнымі. БДА дзейнічала і было створанае згодна з правам, не парушаючы Канстытуцыю. ДВК і суд звышінтэрпрэтавалі 38 артыкул закону аб палітычных партыях. Немагчыма даказаць, што чагосьці не робіш ці чымсьці не ўладаеш. Толькі мерытарычныя засцярогі могуць стаць прычынай выкраслення партыі з рэгістра, яе ліквідацыі, — спасылаецца на запісы Канстытуцыі Пятро Юшчук.

Сённяшні старшыня БДА Яўген Янчук кажа:

— Гэта чарговы крок запалохвання беларускага асяроддзя ў Польшчы, пацыфікацыі беларускіх арганізацый, якія не ўпісваюцца ў краявід польскага жыцця.

Больш памяркоўны старшыня БДА з паловы дзевяностых, гісторык Алег Латышонак:

— Здаецца, што гэта занадта фармалістычны падыход. Я хацеў бы гэта трактаваць як праяву бюракратыі, якая толькі выпадкова збеглася з пракурорскай справай „Нівы" і паслякантрольнымі ўказаннямі NIK у адносінах да школ з беларускай мовай.

БДА падала ў Апеляцыйны суд у Варшаве апеляцыю ад рашэння варшаўскага Акруговага суда, каб справай згоднасці з Канстытуцыяй 38 артыкула закону аб палітычных партыях заняўся Канстытуцыйны трыбунал.

**Мацей Халадоўскі**

*Віншуем нашых чытачоў з Новым годам і Калядамі*
*Рэдакцыя „Нівы"*

### *Жыць па-беларуску* ☞ 2

Яўген Вапа

*На справядлівасць суда няма ў нас, беларусаў, зараз вялікіх спадзяванняў. Усе ж ведаем, што гэта суд дэмакратычнай Польшчы рэабілітаваў Рамуальда Райса „Бурага", на руках якога кроў нявінных беларускіх сем'яў. Так, як зараз адбываецца працэс ліквідацыі Беларускага дэмакратычнага аб'яднання — адзінай партыі нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Прысуд на нас ужо выдадзены...*

### *Мараторый на праўду* ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

*Дзесяць год незалежныя медыі ў Беларусі нішчыліся мэтна і паслядоўна. Прытым перад медыйнымі цэнзарамі і цэрберамі былі (безумоўна, негалосна) акрэслены два заданні. Па-першае, усімі мажлівымі сродкамі выцярэбваць беларускамоўныя газеты, часопісы, тэле- і радыёпраграмы...*

### *Міхалоўская гміна* ☞ 4

*Марк Назарка: У нас візітных картак шмат. У турыстычным плане гэта Семяноўскі вадаём з пляжам. Прыняты план мясцовага добраўпарадкавання Бандароў і Рыбакоў прадбачвае там купальню, прыстань і порт, а на берагах, што ад Шымкаў і Цісоўкі — дачныя ўчасткі; у 2005 годзе прымем такі план для Міхалова і Саколля...*

### *Па-над межамі* ☞ 5

Аляксей Мароз

*Беларускія дэпутаты азнаёміліся з працай няўрадавых арганізацый у Польшчы, іх юрыдычнымі асновамі, фінансаваннем і маштабам дзейнасці. У час размовы з гарадскімі ўладамі госці даведаліся аб арганізацыйнай структуры ўстаноў і найважнейшых лакальных ініцыятывах, рэалізаваных на працягу апошніх гадоў. Удзельнікі праекта мелі нагоду пабываць на гарадской сесіі ў Гайнаўцы...*



### *„Троіца" ў Беластоку* ☞ 8

Ганна Кандрацюк

*Іван Кірчук уражвае сваёй аўтакрэацыяй. Саліст нагадвае візантыйскага патрыярха. У атачэнні інструментаў, якія звычайна займаюць усю сцэну, узнікае ўражанне сутыкнення з шаманам і яго чарадзейнай лабараторыяй. Хопіць пералічыць усе музычныя ўмеласці і набор інструментаў трыо...*



# Мараторый на праўду

Акурат 10 гадоў таму, у лёсаносным 1994 г., 22-24 снежня цэнтральныя беларускія газеты „Рэспубліка", „Звязда", „Советская Белоруссия" былі надрукаваны з белымі плямамі. Не выйшлі тады зусім у свет чарговыя нумары „Свабоды", „Народнай газеты". Прычына той беспрэцэдэнтнай рэакцыі цэнтральных выданняў краіны — забарона ўладамі друкаваць даклад народнага дэпутата тагачаснага Вярхоўнага Савета Сяргея Антончыка пра карупцыю ва ўладных вярхах (адзінай газетай, якая здолела надрукаваць той даклад стала легендарная „Пагоня" — пазней ёй гэтага не даравалі!). Так скончылася адліга для сродкаў масавай інфармацыі Беларусі. З таго моманту дзяржава па сутнасці абвясціла забарону на праўду, якая датычыць галоўных рэчаў і працэсаў у краіне.

Дзесяць год незалежныя медыі ў Беларусі нішчыліся мэтна і паслядоўна. Прытым перад медыйнымі цэнзарамі і цэрберамі былі (безумоўна, негалосна) акрэслены два заданні. Па-першае, усімі мажлівымі сродкамі выцярэбліваць беларускамоўныя газеты, часопісы, тэле- і радыёпраграмы. Прыкладам, на калісьці цалкам беларускамоўным (пра моўны ровень вяшчання тут не кажам) Гродзенскім тэлерадыёаб'яднанні за гэты час зніклі амаль усе аўтарскія творчыя праграмы. У студыі прыйшлі альбо ўчарашнія падлеткі, якія панятку не маюць пра культуру маўлення, альбо асобы, якія знешнім выглядам удаюць на асацыяльныя элементы. Зразумела, што ўвесь новы „творчы патэнцыял" з налётам „костромской" ці „рязанской" правінцыйнасці.

Іншай мэтай дзяржаўных інстытутаў стала выцінанне любых незалежных СМІ, якія ствараліся і дзеілі ў няпростых эканамічных варунках без усялякай дапамогі дзяржавы. Дзяржава не магла цярпець нават тых журналістаў, якія імкнуліся быць нейтральнымі. Тут можна згадаць дастаткова лаяльнага да рэжыму Паўла Шарамета, які вельмі хутка стаў няўгодным. Сродкаў жа ўтаймаваць няўрымслівых „пісацяляў" не бракуе. Як той казаў, „кто к нам с камерай прыдзёт, тот в камеры і памрот". І пайшлі шчыраваць суды ды пракуратуры!

Пільным запатрабаваннем дзяржавы сталі журналісты-халуі і паслугачы. З усіх дзяржаўных медыяў паліліся бурлівыя плыні хлусні і пахлебства таннага культу. Так у Беларусі з'явілася новая катэгорыя „журналістаў" і „аглядальнікаў". Новая таму, што іх нельга параўноўваць са старымі „бэзэсэраўскімі". Многія з тых сапраўды шчыра верылі ў перавагі калгаснага ладу і „саюз непарушны рэспублік свабодных". Працу бальшыні тых вешчуноў можна ацаніць як верную службу савецкаму рэжыму. Цяперашнія палітінфарматары і агітатары куды больш вытанчаныя. Яны не маюць аніякіх трывалых перакананняў, апрача паклікання бясконца хлусіць і бэсціць тых, хто хоча гаварыць праўду, хоча рабіць нешта стваральнае. З дня ў дзень цынікі пяра і мікрафона пырскаюць слінай і як з вядра ліюць брудам. Асабліва цікава слухаць пра жыццё суседзяў — літоўцаў, палякаў, латышоў, украінцаў. Усе сюжэты пабудаваны паводле простай формулы: „як у іх усё кепска і як у нас усё добра". Ну а далёкаму заходняму замежжу абвешчана сапраўдная халодная вайна. Іншая рэч патаўчыся паблізу саноўных целаў дзе-небудзь на пясочку Саудаўскай Аравіі ці паслізгацца на высакагорнай казахстанскай коўзанцы. У брацкіх краінах, як кажуць, і дзіркі грэюць. Шкода, аднак, што феномен халуйства псіхолагамі даследаваны слаба.

Становішча з медыямі дасягнула той рысы, што за абедам паводле парады булгакаўскага літаратурнага героя Праабражэнскага (прафесар сур'ёзна даводзіў, што бальшавіцкія газеты шкодна ўплываюць на страваванне), чытаць ці, барані Бог, глядзець тэлевізію не варта. Але што рабіць апошнім незалежным выданням і асяродкам вольнага слова? Днямі адкрыты ліст адчаю да Аляксандра Лукашэнкі надрукаваў галоўны рэдактар вядомай газеты „Прессбол" Уладзімір Беражкоў. Папулярнае спартовае выданне за крытычныя публікацыі хоча праз суд знішчыць не хто іншы, як міністр фінансаў, а па сумяшчэнні старшыня гімнастычнай федэрацыі Мікалай Корбут. Ягоная „честь" ацэнена ў круглую суму, а яшчэ рэдактару за выкрыванне таталізатарных махінацый пагражаюць расійскія бандыты.

Гродзенскія журналісты сваім парадкам накіравалі ліст да старшыні аблвыканкама з патрабаваннем спыніць татальны пераслед незалежных СМІ. Ніхто і не спадзяецца на станоўчыя зрухі з боку галоўных „вертыкальнікаў", зварот застанецца голасам пустэльніка ў келлі, але важны факт салідарнасці (зварот падпісала звыш 30 асоб) і элементарнай грамадзянскай мужнасці журналістаў.

А праўда не можа быць забаронена, нават калі зноў застанецца адна газета „Правда". Гісторыя можа цярпець толькі мараторый на праўду. Але яе цярпенне хутка лопне.

**Уладзімір Хільмановіч**

# Жыць па-беларуску



Звар'яцеў нам гэты свет, звар'яцела надвор'е, вар'яцеюць палітыкі і падуладныя ім чыноўніцкія дзяржавы. Так найкарацей явіцца мне адышоўшы 2004 год. Кожны з нас мае сваю ацэнку і мерку мінулага ды сённяшняга, хаця на гэта можа будзем мець яшчэ права. На жаль, штораз больш правоў на нашую прыватнасць, погляды і асабістае жыццё маюць спецслужбы — палітычныя, вайсковыя, памежныя, мытныя, падаткавыя, паліцэйскія... Іх мэта — падслухоўваць, запісваць, кампраметаваць непаслухмяных, пашыраць кола стукачоў, якія днём і ноччу будуць пісаць даносы на ўсіх і ўсё. Такім чынам дзяржава будуе сваю „грамадзянскую супольнасць". Мой знаёмы падлічыў, што зараз у Польшчы дзейнічае больш за дваццаць устаноў, для якіх на запісаныя ў канстытуцыі грамадзянскія правы — звычайна напляваць. Такога не было ў Польшчы нават пры камуне. У нашу сённяшнюю сітуацыю больш вобразна і зразумела ўпісваецца Оруэлаў раман „1984". Калі Сакрат Яновіч у сваім фельетоне піша, што ў Еўропе зараз час нацыянальных рэвалюцый, а не класавых, то можна спадзявацца, што гэты працэс можа мець месца таксама яшчэ і ў Польшчы. У 1989 годзе не было ў нас такой нацыянальнай рэвалюцыі, а толькі палітычная дамова, дзякуючы якой кіруючая партыйная вярхушка пераўтварылася ў паўднёва-амерыканскую капіталістычную алігархію. Стварылася дзяржава, у якой звычайны грамадзянін не мае права на які-колеч выйгрыш з сістэмай палітычна-эканамічных судовых працэсаў па заказу правых і левых груп трымаючых у даны момант уладу. Ці зараз польскае грамадства здольнае яшчэ на ўсенародную самаарганізацыю і масавыя пратэсты — не ведаю.

На новы 2005 год не разлічваю. Абы не было горш, — паўтараюць дзесяцігоддзямі сваю надзею на лепшае беларусы Беласточчыны. Абы не было вайны, — экзістэнцыяльна абнадзейваючая мантра чуецца ва ўсіх куточках Рэспублікі Беларусь. Песімізм і фаталізм упісаліся ў беларускую ментальнасць штодзёншчыну так сама моцна як прага хрысціянскага вечнага збаўлення, пасведчанага сотнямі пабудаваных цэркваў і касцёлаў на нашай зямлі сілай духу і за грошы саміх беларусаў. Завешаныя паміж небам і зямлёю ад наканаванага нам лёсу — мы не ўцякаем. Спадзяемся з нашай закамплексаванасцю на нейкую неакрэсленую ласку, цуд, дараванне ці то з боку зямных ці нябесных уладароў. У той жа час зацыкленыя грамадска-палітычнай асцярожнасцю, якая звычайна, па-чалавечы, называецца баязлівасцю, мы не ў змозе адстойваць самых звычайных праваў нацыянальнай годнасці. Беларускі алфавіт выжывання цяжка вывучаць і здзейсняць у штодзёншчыне паняволенай і заражанай чумой страху, асабліва беларускім дзяржаўна-адміністрацыйна-самаўрадавым чыноўнікам, у якіх словы „хочам жыць па-беларуску" выклікаюць страх і нянавісць да нашага роднага — на Беласточчыне і ў Рэспубліцы Беларусь. Застаецца толькі вымольваць „Божа, будзь ім літасцівы" і на чужынскіх мовах даносіць сваё прашэнне Усявышняму. Бо царкве не вельмі хочацца быць з народам, толькі заўсёды з уладамі. І тады ў сваёй партызанскай самотнасці і адзіноце хочам адваёўваць бязмежнае. Як у класічнай антычнай трагікамедыі. Дзеля гэтага сцэнаў і хораў хопіць у нас надоўга.

Таму ў 2005 г. на беластоцка-беларускім панадворку з беларушчынай будуць надалей гуляць выканаўцы чыіхсьці палітычных заказаў. Чакае нас у Беластоку „працэс адзінаццаці" абвінавачаных у справе „Нівы". Дзяржаўны апарат улады не можа прайграць з нейкай там меншасцю. Трэба ёй паказаць сілу і вярнуць усё на свае месца. У 1923 г. у Беластоку меў месца працэс 45-ці нашых продкаў, якія заявілі тады пра свае правы на беларускасць. Суд выкінуў ім гэта з галавы. На справядлівасць суда няма ў нас, беларусаў, зараз вялікіх спадзяванняў. Усе ж ведаем, што гэта суд дэмакратычнай Польшчы рэабілітаваў Рамуальда Райса „Бурага", на руках якога кроў нявінных беларускіх сем'яў. Так, як зараз адбываецца працэс ліквідацыі Беларускага дэмакратычнага аб'яднання — адзінай партыі нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Прысуд на нас ужо выдадзены. Адказ на ўсё гэта павінен быць адзін — мы хочам жыць па-беларуску. У 2005 г. у Польшчы абдудуцца парламенцкія выбары. Выбарчая картка аддадзеная на Беларускі выбарчы камітэт будзе нашым супольным голасам і ў падтрымку „Нівы", БДА, беларускага школьніцтва і культуры, надзеяй на выжыванне беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы.

**Яўген Вапа**

**Вачыма еўрапейца**

# Польшча-міраносіца



З нейкім неспакоем бачыў я масавы штурм непрафесійных назіральнікаў за прэзідэнцкімі выбарамі ва Украіне. У самім толькі Беластоку малады правы дзеяч Марыюш Камінскі і ягоная партыя Права і справядлівасць (PiS) сарганізавала выезд перад выбарчай нядзеляй на Заходнюю Украіну пару дзесяткам асоб. Пэўна, задума была несці такім чынам дапамогу ў захоўванні дэмакратычных прынцыпаў у час галасавання. Ад нейкага часу назіраю за дзеячамі і прыхільнікамі гэтай партыі і цяжка мне пазбыцца ўражання, што, на фоне гэтай „экскурсіі", справа ці не ў „нясенні польскасці", пад маркай падзяліцца вопытам з г.зв. вольнага свету. Дарэчы, невыпадкова адным з падпісантаў заявы поўнасцю адкінуць закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях быў падляшскі сенатар якраз ад Права і справядлівасці — Кшыштаф Юргель. Гэтым самым выказаўся ён за маргіналізацыяй суграмадзян іншага нацыянальнага паходжання і за нацыянальна-этнічна-рэлігійнай аднароднасцю польскай дзяржавы. З другога боку, прыглядаючыся ў тэлебачанні назіральнікам, не толькі ад PiS, якія ад'язджалі на ўкраінскія выбары, з нейкім непрыемным посмакам прыслухоўваўся я скандзіраванню: „Юшчанка, Юшчанка!" Здавалася ж, што адной з мэт міжнародных назіральнікаў якраз з'яўляецца захаванне бесстароннасці, а прынамсі не выказванне сваіх сімпатый кандыдатам як бы ні было чужой і стараючайся здабыць поўную незалежнасць краіны.

Зручнай прычынай для вызначэння сваёй пазіцыі ў адносіах да Украіны і ўвогуле да справы ўсходняй польскай замежнай палітыкі пасля далучэння да ЕС, сярод гэтага і ў беларускім маштабе, стаў візіт шэфа МЗС Владзімежа Цімашэвіча. Сапраўды, некалькі дзён да выбараў прыехаў ён у сталіцу Падляшша на ўрачыстаць прысваення звання *doctor honoris causa* праф. Марыяну Шаматовічу, пачынальніку ў Польшчы і спецыялісту па зачацьцях *in vitro*, міністраваму сябру. Так ці інакай, у час гэтага візіту міністр Цімашэвіч выказаўся наконт украінскага пытання:

— Польскі голас у справе Украіны трактуецца як голас на найвышэйшым узроўні верагоднасці. Факты даказалі, што рацыя за намі. Калі выбары ва Украіне пройдуць у спосаб, які выконвае ўсе дэмакратычныя стандарты, створыць гэта нагоду выступаць з новымі ініцыятывамі дзеля Украіны як і ў НАТО, так і ў ЕС.

Гэта дэкларацыя мае вялікае значэнне, хоць не ведаю, як на тую паслугу для будавання таго верагоднага голасу паўплывалі масы польскіх назіральнікаў, таксама і тых, сарганізаваных беластоцкім PiS.

Незалежна ад таго важным становіцца, што паўтор выбараў ва Украіне стане таксама нагодай думаць і памятаць пра Беларусь.

— Польшча хацела б давесці да таго, каб ЕС падрыхтаваў свой план дзеянняў для Беларусі з пералікам мерапрыемстваў, калі б былі выкананы мінімальныя патрабаванні ў галіне дэмакратызацыі гэтай дзяржавы, — заявіў у Беластоку міністр Цімашэвіч.

У адным з інтэрв'ю дадаў:

— Пазітыўны фінал падзей ва Украіне будзе мець агромную важнасць для сітуацыі ў Беларусі. Афіцыйная прапаганда не зможа ўжо ў верагодны спосаб працягваць сваю сённяшнюю лінію.

Пасля зазначыў:

— Працэсы прабуджэння ў Беларусі будуць адбывацца памалу. Аднак Беларусь з трох бакоў будуць акружаць краіны з адменай палітычнай мадэллю і адносінамі да грамадзяніна.

Скажу, аднак, што назалежна ад развіцця сітуацыі, еўрасаюзны план дзеянняў у адносінах да Беларусі павінен узнікнуць, мабыць, у некалькіх варыянтах, залежных ад узроўню дэмакратызацыйных працэсаў і працэсаў прабуджэння. Пакуль што, да чаго прызнаецца шэф польскага знешнепалітычнага ведамства, праблемай ёсць пераканаць ЕС выкласці грошы на трансгранічнае супрацоўніцтва як з Беларуссю, так і з Украінай. Можа, аднак, якраз таму, што польска-еўрасаюзныя планы дзеянняў у адносінах да Беларусі ды практычныя ініцыятывы ў адносінах да Украіны застаюцца пакуль існаваць у г.зв. віртуальнай сферы.

**Мацей Халадоўскі**

# Цыган вылучаецца

**Слынны цыган Мікалай КАЛІНІН раіць чытачам „Нівы" не верыць цыганкам на вуліцы.**

***— Спадар Мікалай, скажыце, колькі цяпер усяго цыганоў на Беларусі?***

— Існуюць дзве лічбы. Паводле перапісу — 15 тысяч. Беларуская асацыяцыя цыганоў „Рома" падае лічбу недзе ў семдзесят тысяч цыганоў. Я схільны верыць неафіцыйнай статыстыцы. Бо цыганы часам баяцца ці не хочуць прызнаваць сваю нацыянальнасць. І называюцца грэкамі, татарамі, азербайджанцамі, каб пазбегнуць далейшай дыскрымінацыі і палегчыць жыццё дзецям.

***— Спадар Мікалай, ці заўсёды былі цыганы на Беларусі?***

— Не заўсёды. Першая згадка пра цыганоў на Беларусі адносіцца да XVI стагоддзя. У 1592 годзе Статут ВКЛ згадвае цыганскага караля Яна Марцінкевіча. Князь Святаслаў Радзівіл дараваў гэтаму каралю грамату, каб чыніць суд над цыганамі на ўсёй зямлі гэтага князя. Гэты год можна лічыць датай стварэння этнічнай падгрупы беларускіх цыганоў.

***— Чаму цыганы прыйшлі на Беларусь?***

— Дакладна невядома. Верагодней за ўсё наступная версія. Літоўскія феадалы стваралі войска, дзе асноўным „транспартам" былі коні. А хто лепш за цыгана ведае коней?.. Бо цыган умее не толькі выхаваць каня, дагледзець, адрозніць хворага ад здаровага... Цыганы — стыхійна вялікія ветэрынары. Раней любую хворую жывёлу вялі да цыгана.

***— Цыганы, мабыць, вылучаюцца тым, што маюць адметныя спевы, традыцыі, строі. Што са старадаўніх культурных адзнак захавалася да сёння?***

— Захавалася абсалютна ўсё, што было і 500 гадоў таму. Галоўнае, што мы захавалі сваю непаўторную мову. Але, што цікава, цыганы страцілі сваю рэлігію. Памятаем адно імя свайго цыганскага Бога — Дэвэл. І цяпер у любой рэлігіі цыган назаве Бога толькі Дэвэлам.

***— Наколькі вострa стаіць пытанне знікнення цыганскай мовы?***

— Фінскія, іспанскія цыганы нашай мовы ўжо не ведаюць, венгерскія таксама. Пытанне з цыганскаю моваю часта ўздымаецца ў краінах Еўрасаюза. У Савеце Еўропы ёсць аддзел „малых моў", дзе дбаюць пра вывучэнне і захаванне моў нацыянальных меншасцей. У Еўропе любая нацменшасць можа стварыць сваю школу на дзяржаўныя грошы. У Беларусі цыганы такой магчымасці не маюць. Што казаць, калі нават тытульная нацыя — беларусы — практычна пазбаўленыя права на мову... Як ні жудасна гэта гучыць, але становішча цыганскай і беларускай моў у сённяшняй Беларусі вельмі падобнае.

***— У гэтым кантэксце, калі беларусы не вучацца па-беларуску, вам не сорамна нешта казаць?***

— Беларусь ратыфікавала ўсе міжнародныя канвенцыі па справах нацменшасцей. Але ў нашых законах няма дакладнай фармулёўкі, што такое нацменшасць. Гэта я магу казаць як чалавек з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. Закон нібыта вельмі справядлівы, але такі цьмяны!.. Калі дзе-небудзь на Захадзе правы цыгана парушаныя, то любы юрыст з вялікай ахвотай возьмецца за гэтую справу і пераможа ў судзе! Ці ўяўляеце вы такі працэс у Беларусі?..



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

***— Спадар Мікалай, дазвольце мне, як абывацелю, агучыць вобраз цыгана на вуліцы ў свядомасці мільёнаў людзей. „Цыганка ў вочы паглядзіць, галаву задурыць, грошы забярэ". Паспрабуйце зараз растлумачыць гэты міт.***

— Я адкрыта кажу: сярод цыганоў ёсць махляры і злодзеі. Але не болей, чым паміж іншымі народамі! Проста цыган здорава вылучаецца ў натоўпе. Адносна сустрэчы з цыганкай на вуліцы, якая пытаецца пра ваш лёс, скажу адназначна: не верце і ні на што не згаджайцеся! Каб яна сапраўды была відушчай, то гэта вы хадзілі б за ёй, а не наадварот. Цыганка на вуліцы — гэта махлярства. Але нельга ж па адным моманце меркаваць пра ўсю нацыю...

***— А які Ваш вобраз ідэальнага сярэдняга цыгана?***

— Калі казаць пра мінскіх цыганоў, то гэта вельмі багатыя людзі. Калі казаць пра перыферыйных цыганоў, беднасць тут навідавоку. Вобраз блізкі да таго, што стварыў слынны рэжысёр Эмір Кустурыца ў сваіх фільмах „Час цыганоў", „Скупшчыкі пер'я"...

***— То хто ж галоўны вораг цыганоў на Беларусі?***

— Як вам сказаць... Калі, скажам, на Ждановіцкім рынку зловяць двух прадпрымальнікаў без касавых апаратаў, то пакараюць найперш цыгана. Бо ён „чорненькі". Хацця беларус, які гандлюе на кірмашы побач з цыганом ніколі не скажа яму: „Ты, цыганская морда..."

***— Дык можа прыгнятаюць не цыганоў, а ўвогуле „чорных"?***

— У прынцыпе так. Але ж дзе вы бачылі бялявага ды блакітнавокага цыгана?.. Вось і атрымліваецца, што церпім мы ні за што — за колер скуры.

***— Ворагаў мы з Вамі выкрылі. Давайце звернемся да адукацыйнай тэмы. Ведаю, што пытанне гэтае для цыганоў балючае...***

— У Беларусі няма ніводнай цыганскай школы, і нават класа! Хаця ўсюды за мяжою — у тым ліку і ва ўсіх нашых суседніх краінах — такія школы ёсць. Мы даслалі зварот у Міністэрства адукацыі, але пакуль маўчок.

***— Праўда, што некалі былі нават цыганскія калгасы?***

— Былі. Іх некалі загадаў стварыць Сталін. Гэта быў жах! Стварaліся калгасы дзесьці на год. Цыганы саджалі ўсё, вырошчвалі, а пасля збіралі ўраджай, прадавалі яго — і ўцякалі прэчкі!

***— І што ж гэта за работа? „Нармальны калхознік" усё аддасць роднаму калгасу, а сам пампрэ з голаду!***

— *(Смяецца)*. Магчыма і так. Але цыганы — уласнікі. І калі цыган сваімі рукамі вырасціў бульбу, дзяліцца з дзяржавай ён гэтай бульбай не будзе.

***— Падаткаў, відавочна, цыганы таксама не плацяць?..***

— Не плацяць. Але, калі, скажам, у Расіі такія ж самыя цыганы, якія, вядома, таксама не плацяць падаткаў, то там дзяржава разумее, што каб яны плацілі падаткі, дзяржаве трэба дзеля гэтага стварыць умовы.

***— І што — цыган пойдзе на завод круціць гайкі?***

— А чаму ж не?! Я ведаю цыганоў, якія гэтым і зарабляюць на жыццё. Цікава, што ў савецкі час амаль усе цыганы працавалі. І круцілі гайкі, і падмяталі...

***— Добра. Таварыш Калінін, прызнайцеся: Вы — беспрацоўны?***

— Так!

***— І чаму ж Вы да гэтай пары з голаду не памерлі?***

— Так я ж цыган!

***— І што Вы — коней крадзяце?***

— Зусім не. Я маю вышэйшую юрыдычную адукацыю, якая дазваляе мне неяк зарабляць на жыццё. Паверце, што я з радасцю пайшоў бы працаваць па атрыманай спецыяльнасці. Бо маю добрыя характарыстыкі з месца навучання, некалькі разоў праходзіў практыку ў МУС. Але ж не бяруць!

***— Куды асабіста Вы прасіліся на працу?***

— У Міністэрства ўнутраных спраў. Ім няёмка было адмовіць у твар, то пачалі ганяць мяне па медагляды, збіраць розныя даведкі, запатрабавалі згадаць усіх сваякоў... Я ахайна ўсё выканаў. Адказваюць: так, Мікола, усе твае сваякі да 12 калена „чыстыя". Урэшце, калі іншых аргументаў не засталося, мяне проста паслалі куды надалей...

***— Пытанне на развітанне. Спадар Мікалай, адкуль Вы так добра гаворыце па-беларуску?***

— Я нарадзіўся ў Віцебску, скончыў там школу. Пасля ў інстытуце таксама вучыў беларускую. Даскаланаліў мову пераважна на творах Уладзіміра Караткевіча. „Каласы пад сярпом тваім" — гэты раман можна перачытваць вечна... Упадабаўся мне калісьці „След Ваўкалака" Леаніда Дайнэкі... З паэтаў любімы — шаноўны Рыгор Барадулін, якога я паважаю яшчэ са школы. Пасля мне пашчасціла пазнаёміцца з дзядзькам Рыгорам асабіста.

**Гутарыў Сцяпан Луцкі**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

## *У Давыд-Гарадку, цыганскай сталіцы*

У жніўні 2002 года я апынулася ў сучаснай сталіцы беларускіх цыганоў — у Давыд-Гарадку, палескім мястэчку над ракой Горынь.

Гарадок уражвае даваенай драўлянай забудовай, на франтонах дамоў красуюцца салярныя вывы сонца. За санацыі тут раскрунулася вядомая на ўсю Польшчу вытворчасць марожанага і рыбацкіх ботаў.

У цэнтры мястэчка стаіць помнік князю Давіду, які адсылае наведвальніка на Замкавую гару (тыцае ў той бок кап'ём). Замкавая гара — улюбёнае месца мясцовых цыганоў.

Тут жа я пазнаёмілася з Тамарай Вішнеўскай і яе сваякамі з мястэчка (яны на фатаграфіях на гэтай старонцы). Залатазубы Руслан зразу хацеў весці са мною карэспандэнцыю!

— А як ты будзеш перапісвацца, як у цябе адрасу няма, — папракнула хлопца Тамара Аляксееўна, — ты ж як той вецер, кожны дзень у іншым месцы...

Матыў дарогі невыпадковы — у пэўны момант хлопцы без слова падняліся ад стала „на прыродзе" і рушылі палюбавацца коньмі...

**Ганна Кандрацюк**

## Навагоднія разважанні

Пачынаецца Новы год. Які ён будзе — лепшы ці горшы ад мінулага? На гэтае пытанне цяжка адказаць. Грамадству, памойму, прыйдзецца чарговы раз зацiскаць паясок. Высокае беспрацоўе, моцная залатоўка ды нестабільныя падаткі прадвяшчаюць павышэнне цэн электраэнергіі, газу, што практычна абазначае рост цэн харчовых прадуктаў. А зарплаты і пенсіі на месцы. Праўда, урад спадзяецца на большы прыток еўрасаюзных сродкаў на інвестыцыі, але апошнія палітычныя скандалы ў левых дэмакратаў прадвяшчаюць, мабыць, прыспешаныя парламенцкія выбары. Дзеля гэтай справы палітыкі левага, як і правага бакоў больш займаюцца выбарчай кампаніяй, чым бытам грамадства. Кожны маніць абяцанкамі, хадайнічае за выбаршчыкаў. Грамадзянская платформа з ПіСам прапануюць IV Рэч Паспалітую. ПСЛ, напрыклад, пасылае навагоднія і калядныя пажаданні ўсім солтысам у Польшчы і заклікае стаць на баку іхняй партыі, бо яны дапамогуць у хадайнічанні за большыя еўрасаюзныя даплаты.

А нашы пажаданні? Я, асабіста, жадаю рэдакцыі і чытачам больш цеснага супрацоўніцтва ў выдаванні „Нівы”, прыемнага адпачынку ў час Каляд і Новага Года, а перад усім, моцнага здароўя! Няхай 2005 год не будзе горшы за мінулы!

**Уладзімір Сідарук**

## Мова да сцяны альбо да люстэрка

Цяпер па-рознаму ацэньваюць вартасць нашай роднай мовы і як вольна можна ёю карыстацца ў розных месцах, пераважна ва ўстановах. Нядаўна ўвайшоў закон, у сілу якога можам свабодна карыстацца мясцовай гутаркай, калі ў гміне больш палове жыхароў яна родная; у гэтым ліку і наша Дубіцкая гміна. І гэта вельмі добра, бо пры камуне такога закону не магло быць, бо ўсе вышэйшыя партыйныя чыноўнікі паглядалі толькі на Маскву, а ў СССР законнай мовай была толькі руская; у нас гэтую ролю іграла польская мова. Помню, як на партыйных сходах у вёсцы ўсе таварышы з нашых панадворкаў цокалі па-польску, добра гэтай мовы не ведаючы і робячы з сябе дурняў. На маю прапанову, каб спыніць такі „тэатр” і гаварыць па-свойму, ніхто ўвагі не звярнуў, бо адзін перад другім хацеў паказацца дасканалым і вучоным палякам. На гэтых сходах бываў і пакойны Мікалай Самоцік, беларускі дзеяч і сакратар партыі, ды і ён з намі гаварыў па-польску. Камуна, як ніхто, ненавідзела нашай беларускай гутаркі і шкадуюць камуну тыя, што да роднай мовы адносяцца варожа альбо абыякава.

**Мікалай Панфілюк**

# Кірююся патрэбамі людзей



Фота Аляксандра Вярбіцкага

**Размова з войтам Міхалоўскай гміны Маркам НАЗАРКАМ.**

***— Што з'яўляецца візіткай Міхалоўскай гміны?***

— У нас візітных картак шмат. У турыстычным плане гэта Семяноўскі вадаём з пляжам. Прыняты план мясцовага добраўпарадкавання Бандароў і Рыбакоў прадбачвае там купальню, прыстань і порт, а на берагах, што ад Шымкаў і Цісоўкі — дачныя ўчасткі; у 2005 годзе прымем такі план для Міхалова і Саколля.

Праз нашу гміну пралягае унікальны Шлях цэркваў, трасіраваны і пазначаны. На апошнім туркірмашы ў Аполі менавіта ён выклікаў найбольшае зацікаўленне, бо культурная адметнасць прыцягвае. Нядаўна пабывала ў нас дэлегацыя арганізатараў агратурызму з Іспаніі — іх захапленне нашай адметнай сакральнай архітэктурай падмацоўваў яшчэ выдатна валодаючы іспанскай мовай наш ксёндз, які раней амаль дзесяць гадоў працаваў місіянерам у Аргенціне.

У Міхалове фабрыку Сяржана купіў прадпрымальнік з Беластока і праводзіць у ёй капітальны рамонт з мэтай запуску вытворчасці пледаў. Меркавалася, што новая фабрыка ўступіць у ход з вясны 2005 года, але паколькі аб'ём рамонтных прац аказаўся намнога большы, чым спачатку здавалася, яе запуск адтэрмінаваны на восень.

Капальня торфу на Імшары, якою загадвае фірма з Ласіцаў, выпускае глебу пад кветкі, а неўзабаве запусціць вытворчасць субстрата пад шампіньёны.

Канчаецца распрацоўка дакументацыі на пабудову вадаёма на рацэ Супраслі. Ужо ў маі-чэрвені 2005 года хочам пачаць яго пабудову; будзе там і амфітэатр. Пачнём таксама будаўніцтва крытага басейна для плавання пры Пачатковай школе ў Міхалове.

Кожная вёска ў нашай гміне захавала свае адметныя рысы. Ёсць такія вёскі, куды не завітала г.зв. геркаўскае будаўніцтва, дзе захавалася драўляная архітэктура, а людзі ў іх жывуць не паводле гадзіннікаў, але ў згодзе з біялагічным часам.

На тэрыторыі нашай гміны ёсць трынаццаць агратурыстычных кватэр, згуртаваных у аб'яднанні „Агракрэсы”. Ёсць гатэль у Ялоўцы. Там і руіны касцёла з адаптаваным алтаром, дзе ўлетку адбываюцца набажэнствы.

У нашай гміне працуе пяць асяродкаў здароўя, якія гарантуюць скоры доступ да экстраннай медыцынскай дапамогі. Маем тры добра аснашчаныя школы (да субвенцыі даплачваем паўтара мільёна злотаў), з якіх добры кантакт з бацькамі. І рэдкая ў сельскай тэрыторыі навінка — у Міхалове дзейнічае банкамат Кааператыўнага банка, дзе ў любы час можна ўзяць грошы.

***— Ці маеце карысць з пралягаючага праз вашу гміну газаправода?***

— Вялікую карысць, бо падаткі, якія маем ад яго, большыя за бюджэты суседніх гмін. Гэтыя грошы прызначаем на папраўу навучання дзяцей, падтрымку працаўладкавання і разбудову інфраструктуры. Беспрацоўе ў нашай гміне на ўзроўні 6%. У 2003 годзе створана ў нас 120 сталых месцаў працы, а на звыш 80 з іх уладкаваны жанчыны.

У 2004 годзе мы рэалізавалі 35 інвестыцый.

***— А як маюцца справы сельскай гаспадаркі?***

— У гміне маем за сто „банякоўцаў” — уласнікаў малочных умяшчальнікаў; гэта куды больш, чым для прыкладу, у суседняй Гарадоцкай гміне. Вёска Пянькі пастаўляе найбольш малака ў маштабе ваяводства. Многа малака пастаўляюць сяляне з Кабылянкі, Казімярова, Новай Волі і Юшкавага Груда. Ёсць таксама птушкафермы і гаспадаркі, накіраваныя на расліннную прадукцыю. Сельскай гаспадаркай у нас займаецца многа маладых людзей. Гэта на гмінныя ўлады ўскладвае дадатковую нагрузку, бо трэба абяспечыць даезд цяжкіх машын у поле ці да тых умяшчальнікаў: пракласці дарогі (напрыклад у Новай Волі каля каланчы) ці расчысціць іх ад снегу.

***— Гаспадарка ў вашай гміне выглядае аптымістычна, але пра культуру, асабліва беларускую, неяк навонкі не чуваць. У суседніх Гарадоцкай і Нараўчанскай гмінах дзейнічаюць шматлікія беларускія калектывы. Чаму ў гэтай дзялянцы ваша крэатыўнасць так нязначная?***

— Гэтая дзялянка запушчалася гадамі, а я тут толькі ад двух гадоў. Лічу, што ў нас вялікія традыцыі, звязаныя з беларускай культурай і гэта хочам падкрэсліць, ладзячы фэсты ў Бандарах. Ёсць мясцовасці, якія самі па сабе расспеўваюцца, у нас такой традыцыі не хапае. У 2003 годзе мы хацелі арганізаваць беларускі калектыў; за гэтую справу ўзяліся міхалоўскі псаломшчык з жонкай, але ён нядаўна быў высвечаны на дыякана і спыніў гэтую працу. Калектыў ужо быў крыху завязаўся, аднак складана знайсці яму мастацкага кіраўніка. Мы наладзілі сувязь са спадарыняй Ласкевіч і яна стараецца знайсці нам такую асобу, але і ёй складана гэта рабіць; знайшлі адну асобу недзе з-за Нараўкі, яле яна з-за занятасці не прыняла нашай прапановы. Маем сродкі, будуць строі, ёсць умовы: святліцы ў Ялоўцы, Шымках, Бандарах, Новай Волі, Геранімове і сезонная ў Саколлі. Стараемся зрабіць зрух, але на гэта патрэбны час.

***— Мо гэтай справе паспрыялі б кантакты з беларускім бокам; ці ваша гміна такія ладзіць?***

— Так, былі сустрэчы з Берастаавіцай і Свіслаччу.

***— Хіба толькі адно адміністрацыйнае кіраўніцтва сустракалася?***

— Да нас прыязджалі калектывы з Беларусі.

***— А ад вас?***

— Не было каму. Два гады таму не было ў нас ніводнага калектыву. Толькі новая загадчыца Гміннага цэнтра культуры намагаецца напачатак стварыць дзіцячыя калектывы. Нядаўна яна прасіла солтысаў дапамагчы знайсці крэатыўных людзей у сваіх мясцовасцях.

***— Мне здаецца, што ў Міхалове спецыфічны нацыянальны клімат, неспрыяльны выяўленню мясцовай культуры...***

— Мы намагаемся прыцягнуць да культурнай працы новых людзей, якія больш адкрыта паставяцца да мясцовай спадчыны.

***— У Міхалове была пабудавана пачатковая школа за сродкі Міністэрства нацыянальнай адукацыі, прызначаныя на патрэбы беларускай меншасці. Чаму там не навучаецца беларуская мова?***

— У сваіх дзеяннях кірююся патрэбамі людзей. Калі б гэта запатрабавалі бацькі, не бачу ніякіх перашкод; ад іх павінна сысці ініцыятыва. Нельга інвеставаць у вышэйшыя мэты, не ствараючы для іх падстаў. Я стараюся людзей асвойваць з іншым бачаннем свету. Вось нядаўна мы зрабілі браму ў муры паміж праваслаўнымі і каталіцкімі могілкамі, такую „экуменічную”, і гэта спадабалася так святарам, як і вернікам.

***— З візіткі вашай гміны я невыпадкова пачаў размову. Вось даведнік „Беларускія пісьменнікі”, дзе шырока вядомыя выхадцы з Міхалоўскай гміны: Мікола Гайдук і Алесь Барскі; здаецца, што яны мала вядомыя ў іх Малой Айчыне...***

— Тут дзейнічае прынцып суседа. А кіраўніцтва гміны мудрае мудрасцю сваіх людзей. І ў нас сёння так як з поездам: цяжка яго рушыць з месца, але пасля набірае ён ходу.

***— Дзякую за размову.***

— Я, карыстаючыся нагодай, жадаю Рэдакцыі і Чытачам „Нівы” усяго добрага з нагоды Каляд і Новага года.

**Размаўляў Аляксандр Вярбіцкі**

# Станоўчы вопыт — Беларусі

Дэпутаты з Міншчыны і Брэстчыны, члены грамадскіх арганізацый і журналісты пабывалі з 29 лістапада па 2 снежня ў Гайнаўцы, дзе знаёміліся з дзейнасцю гарадскога і павятовага самаўрадаў. Былі яны апошняй групай, якая наведала Польшчу ў рамках праекта „Падляшша — Беларусь. Дыялог самакіравання”, арганізаванага Форумам самакіравання ў РП.

Беларускія дэпутаты азнаёміліся з працай няўрадавых арганізацый у Польшчы, іх юрыдычнымі асновамі, фінансаваннем і маштабам дзейнасці. У час размовы з гарадскімі ўладамі госці даведаліся аб арганізацыйнай структуры ўстаноў і найважнейшых лакальных ініцыятывах, рэалізаваных на працягу апошніх гадоў. Удзельнікі праекта мелі нагоду пабываць на гарадской сесіі ў Гайнаўцы і даведацца пра супрацоўніцтва павятовага старостваз гмінымі ўладамі.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Выезды ўдзельнікаў праекта перапляталіся з дакладамі*

— У нас зараз немагчыма так разгарнуць дзейнасць самаўрадаў, як у Польшчы. Наша задача ў Беларусі — паказаць практычна, як можа быць арганізаваная дзейнасць органаў самакіравання. Некаторы вопыт можна пераняць з Падляшша і выкарыстаць у нашай арганізацыйнай працы, — мяркуе Аляксандр Жучкоў, старшыня праўлення Фонду імя Льва Сапегі, які з'яўляецца беларускім суарганізатарам праекта.

— Аб'ядноўваючыся вакол тэрытарыяльных камітэтаў і няўрадавых арганізацый можна выкарыстаць вопыт з Польшчы, — сказаў Вячаслаў Чарняўскі з няўрадавай арганізацыі Цэнтр сацыяльных інавацый, які раней быў дэпутатам Гарадскога савета ў Мінску.

Госці з Беларусі наведалі Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы і пабывалі там на ўроку роднай мовы. Дырэктар Яўген Сачко і яго намеснік Аляксандр Лаўрыновіч расказалі аб працы школы, паказалі класныя кабінеты. Дэпутат Гарадскога савета ў Фаніпалі Анатоль Байдак пахваліў белліцэй за добрыя ўмовы працы. Дырэктар Гімназіі ў Фаніпалі Аляксандр Васількевіч рады быў бы, калі б наладзіліся кантакты паміж моладдзю з Беларусі і Польшчы.

— Я вельмі рада, што ёсць беларускае жыццё на Беласточчыне. Добра, што ёсць магчымасць вучыцца па-беларуску. Калі б была пастаянная і планавая падтрымка беларускай дзяржавы, лепш развівалася б вучоба беларускай мовы ў Польшчы. Грамадскімі пачынамі мала можна зрабіць у гэтай справе. Супрацоўніцтва з замежжам павінна ісці на дзяржаўным узроўні і адбывацца пастаянна. Добра было б арганізаваць экскурсіі для моладзі. Трэба было б наладзіць курсы для настаўнікаў і арганізаваць абмен навучэнцамі. Добра было б так арганізаваць супрацоўніцтва, каб беларусы Беласточчыны не адчувалі сябе замежнікамі, але беларускай дыяспарай, — сказала Алена Макоўская, старшыня Рады Міжнароднага грамадскага аб'яднання Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына”. — Прыемна, што чыноўнікі з Гайнаўкі размаўлялі з намі на гутарковай беларускай мове. Калі людзі імкнуцца размаўляць па-беларуску, значыць, мова яшчэ жыве.

Алена Гайдук з Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў Дзяржынску заўважыла, што ў галіне арганізавання адукацыі жыхары Польшчы могуць таксама вучыцца ад беларускіх калег. Сказала яна, што ў беларускіх школах з вучнямі, апрача педагогаў, пастаянна працуюць псіхолагі. Калі б польскія адукацыйныя ўлады рашыліся на такое вырашэнне, маглі б абмежаваць выхаваўчыя праблемы ў школах. Міхал Голуб расказаў пра грамадзянскія выбарчыя камітэты пасля 1989 года. Звярнуў ён асаблівую ўвагу на Беларусі выбарчы камітэт, які дзейнічаў на Гайнаўшчыне. Былы бурмістр Гайнаўкі Ядвіга Рудзінская-Патэюк расказала пра арганізацыйную структуру, кампетэнцыі і заданні гарадской гміны. Паінфармавала яна, што нядаўна памяняліся ўмовы арганізавання культурных мерапрыемстваў. Раней беларускія фэсты ў Гайнаўцы часта арганізаваны былі ў супрацоўніцтве з БГКТ. Зараз бурмістр горада павінен абвяшчаць аўкцыёны і вылучаць да супрацоўніцтва тыя арганізацыі, якія прадставяць найлепшыя праекты арганізавання беларускіх мерапрыемстваў.

У Гарадскім асяродку сацыяльнай дапамогі беларускія госці пазнаёміліся з забеспячэннем людзей, якія не могуць знайсці працу і пазбаўлены сродкаў на ўтрыманне сем'яў. Намнога больш людзей застаецца без працы ў Польшчы, чым у Беларусі. Ёсць такія жыхары Гайнаўкі, якія часта карыстаюцца сацыяльнай падтрымкай і адмоўна ацэньваюць дэмакратычныя перамены ў Польшчы. На ўдзельніках праекта вялікае ўражанне зрабіў мясцовы дом сацыяльнай дапамогі, які знаходзіцца ў прыгожа адрамантаваных памяшканнях.

— Мяне станоўча ўразілі адносіны сацыяльных работнікаў да пацыентаў. Відаць на працы любоў і сяброўства, — заявіў Анатоль Байдак, дэпутат Гарадскога савета ў Фаніпалі.

Беларускія дэпутаты пазнаёміліся з дзейнасцю Водаправодна-каналізацыйнага прадпрыемства, якое абслугоўвае ўсю Гайнаўку. У Гайнаўскім доме культуры госці даведаліся пра арганізацыю беларускіх мерапрыемстваў і супрацоўніцтва гарадской установы з пагранічнымі рэгіёнамі Беларусі. Удзельнікам праекта спадабаўся Свята-Троіцкі сабор у Гайнаўцы. Зацікавіла ў ім бакавая царква ў гонар усіх святых Беларускай зямлі. Госці цікавіліся таксама Беларускім музеем у Гайнаўцы і магчымасцямі яго выкарыстання для патрэб беларускай меншасці.

**Аляксей Мароз**

## Увага! Ашуканцы!

Візіт звычайна пачынаецца з пытанняў пра аплату тэлевізійнага абанементу. Да выбранай хаты ўваходзіць ягамосць з нейкай кнігай пад пахай і пытаецца ці абанемент заплачаны. Але праз момант тлумачыць: „Але ж не, вы ўжо звольнены з гэтага абавязку па прычыне ўзросту”. Потым запісвае нумар дома, распытваецца пра членаў сям'і, марку прыёмніка і ўрэшце выяўляе істоту справы: „Мы тут налічылі 16 такіх чалавек як вы, адзінокіх, якім споўнілася 75 гадоў. Для такіх асоб наша фірма (назва фірмы не выяўляецца!) падрыхтавала святочны падарунак. Зараз я вам яго перадам!” І праз момант у хату ўваходзяць дзе асобы з вялікай сумкай і дастаюць з яе электрычны чайнік, электрабрытву, прыбор для памеру ціску крыві... ды набор відэльцаў, лыжак і нажоў. Аказваецца, што ў рамках „падарунка ад фірмы” за сталовы набор трэба будзе заплаціць, „але толькі палову цаны і то не адразу, толькі праз два тыдні”, а астатнія рэчы будуць уручаны зусім дарма.

Не ведаю, як развіваліся б падзеі гэтага махлярскага спектакля, бо пад дом суседкі, якую якраз „абдароўвалі” ашуканцы, на машыне пад'ехаў зяць і дабрадзеі, хуценька сабраўшы свае „святочныя падарункі”, спешна развіталіся і ад'ехалі.

Махляры ўчора былі ў нашай вёсцы, сёння могуць быць у вашай, шаноўныя чытачы, заўтра яшчэ ў некага іншага. Не давайма абмануць. Гэта ашуканцы! Дарма, каханенькія, бывае толькі сыр у мышалоўцы! Жывем мы ў краіне, дзе ўсе — ад прэзідэнта да рэферэнта — схільны браць, а не даваць. Падарунка, калі самі сабе не заробім, ад чужых напэўна не атрымаем! Не пускайма махляроў у нашы дамы! Будзьма разважнымі і недаверлівымі ў адносінах да чужых! Пакуль не позна.

**М. Ц.**

## Шлюбным медалі

19 лістапада 2004 г. у Чаромхаўскім ЗАГСе арганізавалася сустрэча з жыхарамі гміны, якія адзначалі 50-гадовы юбілей з дня шлюбу. У мерапрыемстве ўдзельнічала шэсць шлюбных пар: Мар'я і Ян Міркоўскія, Лідзія і Дзмітры Кердалевічы з Чаромхі-Вёскі, Анна і Мікалай Каплуны, Зінаіда і Мікалай Каплуны з Баброўкі, Яўгенія і Міхаіл Мусюкі, Юлія і Эдуард Залеўскія з Чаромхі-Станцыі. Адсутнічалі: Надзея і Мікалай Стэльмахі з Чаромхі-Станцыі і Ванда-Казіміра Юрчук з Баброўкі. Яе муж Анатоль памёр напярэдадні ўрачыстасці.

Ад імя прэзідэнта Рэчы Паспалітай памятныя медалі юбілярам уручыў войт гміны Міхал Врублеўскі ў прысутнасці кіраўніка ЗАГСа Аліны Пытэль і старшыні мясцовай арганізацыі Саюза польскіх пенсіянераў Юзэфа Дубковіча. Былі віншаванні, шампанскае, падарункі з кветкамі і многія... успаміны. Вандзе-Казіміры Юрчук з Баброўкі, па прычыне смерці мужа, медаль быў уручаны асабіста.

**(ус)**

## Архітэктура Міра

Пачатак трэцяга тысячагоддзя для гарадскога пасёлка Мір і жамчужыны Сярэднявечча — Мірскага замка найбольш спрыяльны. І хоць пакуль ідзе рэстаўрацыя, але ён паранейшаму ў цэнтры цікавасці як турыстаў, так і людзей творчых прафесій і, вядома ж, фотамайстроў. У выдавецтве „Юніпак” выдадзены ўдалы камплект фотаздымкаў, дзе адлюстраваны Мірскі замак, экспанаты, якія размешчаныя ў вежавым музеі, архітэктурныя збудаванні, гістарычныя мясціны Міра. А зараз яшчэ адзін камплект з 16 фотаздымкаў Анатоля Клешчука, які выйшаў тыражом 3 000 экземпляраў у друкарні „Геапрынт” прыемна ўразіў, дзе — сённяшні Мір, і, вядома ж, вежы „чырвонага замка” (на здымку), а таксама імгненні свята Дня беларускага пісьменства ў 2002 годзе.




А напярэдадні навагодніх свят РУП „Белпошта” накладам у 8 тысяч экземпляраў выдала навагоднюю паштоўку. Прыемна такой павіншаваць родных ці сяброў.

**Пётр Жэбрак**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Бельскія гімназісты з настаўнікам Ярaславам Падольцам*

# Пытанні пад аранжавы колер

— А што чытаеце ў „Зорцы”? — пытаю бельскіх гімназістаў?

— Усё! — чую ў адказ.

Настаўнік Яраслаў Падолец успамінае зрух, які выклікаў наш „Конкурс з рыцарам”.

— Яны проста кінуліся на Інтэрнэт, каб адшукаць падляшскія гарады з рыцарам у гербе. І тут не ішло пра ўзнагароды — на першым месцы была цікавасць. Мігам адшукалі ўсе падляшскія гарады: ад Саколкі па Сямятычы. Бо задачы па рэгіянальнай тэматыцы карыстаюцца вялікай зацікаўленасцю.

Але не адным Інтэрнэтам ды рэгіянальнымі справамі жыве гімназія.

Яраслаў прадстаўляе класных аматараў-палітолагаў. У І „д” ужо можна засноўваць палітычную партыю!

— Як пачнуць пытаць і спрачацца за палітыку — то як у Сеймавай следчай камісіі, — жартуе настаўнік.

У апошні час актыўнасць школьных палітолагаў яшчэ павялічылася. Гэта па прычыне аранжавай рэвалюцыі на Украіне. Моладзь гутарыць пра Беларусь.

— Ці Беларусь стане, — пытаюць настаўніка, — змагацца за дэмакратыю як украінцы?

Сапраўды, вырастае нам новае пакаленне. Грамадскія пытанні як ніколі кранаюць сучасную моладзь. З’яву назіраю ва ўсіх школах, у якіх праходзяць нашы сустрэчы. Часта наракаем, што моладзь надта прыклееная да камп’ютэра ды нічым не цікавіцца. Аднак кантакт з тэхнікай пашырае далягляд, уплывае на рост грамадскай свядомасці.

Палітыка не ўсіх накручвае і распальвае.

Найбольш дапытлівая Аня Бароўская (паводле настаўніка, будзе з яе добрая журналістка) ставіла пытанні з філасофскім ухілам. Напрыклад, якія каштоўнасці найважнейшыя для чалавека?

* * *

У І „д” класе пяць новых вучняў — так завуць школьнікаў, якія раней не вучыліся ў „тройцы”.

Прыйшлі сюды з-за высокага ўзроўню навучання.

— Для мяне важная атмасфера ў класе, — кажа „новая” гімназістка з першай парты. — Я маю гарантыю, што ніхто не будзе мяне праследаваць за перакананні. У старой школе было паразнаму. Напрыклад, калі набліжаўся ўрок праваслаўнай рэлігіі, на якую хадзілі толькі чатыры асобы з класа, здараліся брыдкія ўвагі ў наш адрас...

„Новых” не палохаюць дадатковыя ўрокі беларускай мовы, хоць яны пасля ўсіх астатніх заняткаў.

— „Тройка” файная, — згодна сцвярджаюць.

На канец гутарым пра поспехі гімназістаў. Настаўнік называе яшчэ ўдзельнікаў беларускіх конкурсаў. У прадметным конкурсе вылучылася **Юстына Пагрэбняк**. У дэкламатарскім — **Ева Шырэнос, Караліна Ігнацюк, Эльвіра Драбнікоўская, Юстына Пагрэбняк**.

— І яшчэ нашы дзяўчаты спявалі ў „Жураўінцы”, — дадаюць хорам хлопцы.

Папоўню, што гімназісты не толькі ставілі мне разумныя пытанні. Яны карысталіся добрай беларушчынай!

Зорка

Час рыцараў

# Кроў на турніры

Турнір меў свой парадак. Ужо сам пачатак выклікаў настрой вайны. Рыцары рушалі ў бой галопам і змагаліся на коп'і.

Перамога належала таму ваяру, які першы высадзіў з сядла саперніка або выбіў у яго шчыт. Хоць кап'ё было спецыяльна ступленае, здараліся смяротныя выпадкі. Дзеля бяспекі, ад XV ст. арганізатары турніраў пачалі ставіць платы паміж полем бою і месцам для публікі.

На вачах гледачоў разгараўся рэгулярны бой. Калі прыходзіла пара стануць у шранкі, групы сапернікаў — рыцараў і пехацінцаў — з імпэтам кідаліся на сябе ў бой. Іх мэтай было апанаванне поля змагання. Турнір нагадваў сапраўдную бітву. Лілася кроў, з кожнага месца даходзіў бразгат зброі і енкі параненых. Сапернікаў трэба было скінуць з коней і прымусіць да капітуляцыі.

Першыя ваяры, зоркі турніру, узнагароджваліся. Дадаткова яны забіралі коней сваіх пабітых сапернікаў. Выйгрыш прызначалі на прызы і гулянкі. Самых слаўных ваяроў князь запрашаў на замак і прапанаваў уступіць у княжацкую дружыну.

Супраць турніраў выступаў касцёл, які пад канец XII ст. нават забараніў іх арганізаваць. Але гэтая забарона не дала жаданых вынікаў. Турніры ўсё карысталіся вялікай папулярнасцю.

(працяг будзе)

**Зорка**




*Святочныя паштоўкі прадаюць дзеці з беларускіх груп*

## Вершы Віктара Шведа

### *Спявайце калядкі!*

*Бог людзям паслаў з нябёс*
*Божае Дзіцятка.*
*Нарадзіўся нам Хрыстос —*
*Паплылі калядкі.*

*Спіць на сене ў яслях Ён,*
*Пад апекай Маткі,*
*І Яму з усіх старон*
*Чуюцца калядкі.*

*Спі, наш Збаўца, наш Тварэц!*
*Хлопцы і дзяўчаткі*
*Будуць заўжды Табе пець*
*Слаўныя калядкі.*

*З васьмікутнаю звяздой,*
*Ад хаты да хаткі,*
*Усе мы пойдзем грамадой*
*Праспяваць калядкі.*

# Легенда пра Бельск-Падляшскі

(прыдуманая)

Даўно-даўно таму, там дзе сёння Бельск-Падляшскі, панаваў кароль Падляш і каралева Бельскіня. Яны былі вельмі добрыя.

Аднойчы каралева прапала. Кароль шукаў яе тры гады, але безвынікова. І вось адной ночы Падляшу прыснілася Бельскіня. Яна сказала, што калі кароль выратуе яе ад злога велізарнага пацука, то яны будуць назаўсёды разам, пакуль іх не разлучыць смерць. Меў ён пайсці ў лес і ісці там таемнаю дарожкай. Кароль Падляш гэтак зрабіў. Праўда, крыху баяўся, але быў гатовы зрабіць усё, каб зноў быць са сваёй каханай.

Урэшце ён дайшоў на месца, а там — велізарны пацук ужо хацеў з'есці Бельскіню. Падляш хутка кінуўся на дапамогу. Стаў размахваць мячом перад пацуком, але той не спалохаўся, бо кароль быў у тры разы меншы ад яго. Пацук паваліў караля на зямлю, а прытым зачапіў кіпцюром Бельскіню. Яна была смяротна раненая. Кароль не здаваўся, атакаваў пацука, але, на жаль, не меў з ім ніякіх шанцаў. Пацук зноў кінуў каралём моцна аб зямлю і закапаў яго. Бельскіня і Падляш памерлі, а пацук пайшоў шукаць шчасце ў іншае каралеўства. Бельскіня і Падляш з гэтай пары былі ўжо заўсёды разам.

На памяць гэтай каралеўскай пары, якая так добра панавала, узялася назва горада Бельск-Падляшскі. Бельск — ад Бяльскіні і Падляшскі — ад Падляша.

*Юліянна Дораш, Гімназія н-р 3 у Бельску-Падляшскім*




# Калядныя паштоўкі

Ужо другі год у Беластоку можна купіць беларускія святочныя паштоўкі. Святочны кірмаш працуе ў Пачатковай школе н-р 4 (на перапынках), паштоўкі прадаюць дзеці з беларускіх груп — яны прапануюць дзесяткі фантастычных узораў на польскай і беларускай мовах. Першымі пакупнікамі тут бацькі і настаўнікі. Ідэю святочнага кірмашу прыдумала настаўніца Аліна Ваўранюк. Яна разам з дзеткамі займаецца ўсёй вытворчасцю і продажам. **Зорка**

# Польска-беларуская крыжаванка № 1

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку н-р 49**: Звон, воля, смех, снежань, механік, флаг, сава, камедыя. Куфаль, зуб, смак, снег, мех, сум, вежа, бохан, від, нянька.




Узнагароды — **запісныя кніжкі** — выйгралі: **Анэта Кузыка**, **Раксана Казлоўская** з Новага Корніна, **Арэк Галёнка** з Пасечнікаў-Вялікіх, **Эвеліна Прабуцкая**, **Паўліна Лук'янюк**, **Мар'янна Садоўская** з Нарвы, **Юстына Смольская** з Новага Ляўкова, **Караліна Янюк** з Масева, **Магда Кандрацюк** з Нараўкі, **Аня Раманюк** з Гайнаўкі, **Ева Кірылюк**, **Аня Селеванюк**, **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

# Званочак Рапунцэль

І вось пачалося апошняе прадстаўленне вандроўных артыстаў. Стаялі дзівосныя ліпеньскія вечары, калі купальская зеляніна буяе, нібыта ніколі не настануць халады, і русалкі бесклапотна бегаюць у празрыстых кашулях па высокай прыбярэжнай траве, срэбнай ад расы.

На развітанне артысты паказвалі ўпадабаную ўжо гледачамі гэтага замка казку пра замежную красуню Рапунцэль, якую бацька зачыніў у каменным доме, а яна пакахала прыгожага рыцара і, каб ён мог падняцца да яе, апускала ў акно свае доўгія-доўгія залатыя косы.

Вядома, ролю Рапунцэль іграла Агнешка. У яе быў прыгожы парык, звіты з лёну. Рыцар з драўляным велізарным мячом падыходзіў пад акно, прарэзанае ў дашчаным шчыце, і прамаўляў: „Рапунцэль, Рапунцэль, апусці да мяне свае косы!" І ўсё гледачы вельмі смяяліся, бо па косах Агнешкі-Рапунцэль рыцар узбіраўся, як сабака на дрэва. Толькі з дапамогай блазна Марцэла ён ускарасквўся да сваёй каханай. Але зараз жа выскокваў вонкі, і ў акне паказваўся раз'ятраны бацька красуні з прывязанай аўчынай барадой і пагрознай доўбняй у руцэ.

Прыслугу, якая таксама збіралася паглядзець на вясёлых гасцей, асабліва смяшыла імя гераіні. „Рапаца, Рапуца"— паўтаралі яны кожны на свой лад, і нават між сабой называлі гэтак Агнешку. А пан задаволена пагладжаў на сваю будучую „здабычу" і нават паслаў да дзяўчыны на сцэну сказаць, каб з'явілася ў вежу ў гэтым жа прыгожым касцюме.

(працяг будзе)

*Людміла Рублеўская*

*Іван Кірчук нагадвае візантыйскага патрыярха. У атачэнні інструментаў, якія звычайна займаюць усю сцэну, узнікае ўражанне сутыкнення з шаманам і яго чарадзейнай лабараторыяй...*

# „Троіца” — антэна ў космас

— Дзякую, што запрасілі! — Іван Кірчук, лідэр этна-трыо „Троіца” быў задаволены ўражлівай публікай, — а то кожны раз, калі едзем у Варшаву ці Скярневіцы, мінаем ваш горад.

Песні беларускага этна-гурту дзякуючы нідэрландскай фірме „PAN Records” прадаваліся па ўсёй Еўропе, у Японіі, Індакітаі... У апошні час „Троіца” выступае ў вялікіх канцэрт-холах і ў сталіцы Беларусі.

Вось нядаўна, 16 снежня 2004 г., першы этна-шаманскі беларускі гурт запрэзентаваўся ў беластоцкай кавярні „Фама”. Дарэчы, гурт ужо другі раз наведаў наш горад, другі раз па запрашэнні Звязу беларускай моладзі — арганізатара другіх „Музычных зімовых сустрэч”.

Канцэрт, які быў упісаны ў прэзентацыю новага кампакт-дыска, стаўся падзеяй у музычным свеце горада.

І хоць, як адзначыў Іван Кірчук, „Троіца” не змагла прыехаць з усімі сваімі інструментамі, спадзяванні перасягнулі самі сябе! Спевакі, цалкам загаварылі зубы тлумнай публіцы. Спачатку моладзь трэба было суцішаць (вядома, як у кафэбары), паступова зала моўкла, каб у канцы пакарыцца харызматычнаму голасу саліста, ды, на канец, не адпускаць гурт са сцэны.

А на развітанне сама зала выплескала інструментальную аранжыроўку шэдэўра „Яблынь моя”...

* * *

Іван Кірчук уражвае сваёй аўтакрэацыяй. Саліст нагадвае візантыйскага патрыярха. У атачэнні інструментаў, якія звычайна займаюць усю сцэну, узнікае ўражанне сутыкнення з шаманам і яго чарадзейнай лабараторыяй. Хопіць пералічыць усе музычныя ўмеласці і набор інструментаў трыо:

— Іван Кірчук — вакал, гітара, домра, смык, гуслі, дудкі, жалейкі, губны гармонік, ліра, акарыны, дрэва дажджу;




Іван Кірчук (злева) — вакал, гітара, домра, смык, гуслі, дудкі, жалейкі...

— Юрый Дзмітрыеў — 6- і 12-струнная гітары, домра, смык, цытра, вакал;

— Юрый Паўлоўскі — бубны, гонгі, дарабука, гунданг, анклуны, званы.

І пры ўсім багацці інструментаў, самае ўнушальнае і выразнае ў гучанні — слова. Яно — як антэна ў космас!

Музыкі адзначаюць, што іх цікавіць не форма, а змест песень. Нельга спыняцца толькі на тым, што чуеш у этнаграфічных экспедыцыях, заўсёды змяняецца інструментарый, заўсёды ідзе пераасэнсаванне кантэксту, але сутнасць песні не змяніцца, калі нейкі аўтахтон выявіць яе інструментальны лад на вуснах, а музыка-прафесіянал потым сыграе на варганах або акарынах. Галоўнае — прыкмеціць глыбінны сэнс і захаваць яго.

* * *

Невыпадкова адзін з сольных альбомаў „Троіцы” завецца „Спадчына загінуўшых вёсак”. Асабліва пасля чарнобыльскай аварыі, калі Палессе, вядомае ў свеце як самы архаічны культурны востраў Еўропы, гінула з дня ў дзень. Праўда, ніхто тады не прадбачваў сусветнай моды на усё што „этна” ды сам запіс фальклору напамінаў ратаванне маёмасці з занятай пажарам хаты. Пасля ўсіх няшчасцяў беларуская этна-музыка сёння сярод першых у Еўропе. Хопіць прыгадаць этна-гурты „Юр’я”, „Ліцьвіны”, „Кудзьмень” або падшытыя фальклорам „Палац”, „Крыві”, „Зніч”.

„Троіца” — асаблівая. Вакол трыо аўра белай магіі. У сутнасці ідзе тут пра тэкставую медыцыну. Іван Кірчук з касмічным адчуваннем дакранае кшталты слоў і значэнняў рытуальнай песні. Яе магічная аўра падмацаваная зразумелай сучаснаму слухачу музыкай. Як і прыстоіць у эпоху „глабальнай вёскі”, яна складзена з многіх, часта экзатычных рытмаў. Некаторыя з інструментаў, як дрэва дажджу (пушка з кактусавым насеннем), — інспіраванае фальклорам пустынных этнасаў.




У канцы госці „Фамы” пакарыліся харызматычнаму голасу саліста

У апошнім альбоме „Троіцы” — чатырнаццаць твораў, між іншым, „Па морачку”, „Дубравушка”, „Сонюшко”, „Раек”, „Ні парой...”, „Юр’я”, „Сем чарак”. Паміж песнямі — замовы. У выніку атрымаўся метафізічны пераказ, напоўнены драматургіяй і подыхам космасу.

Таксама ў час канцэрта запрэзентаваўся вядомы рапер ды ды-джэй Pomidoroff (Аляксандр Памідораў). Цудоўна-аўтэнтычна атрымаліся жыдоўскія балады, якія ўвойдуць у яго новы альбом. Тут, між іншым, балада пра дзесяць братоў, якія па чарзе ўміраюць. Выжыве толькі адзін. Пры апакаліптычным змесце песня ўражвае радасным прыпевам, які славіць цуд жыцця.

**Ганна Кандрацюк**

# Беларускі юбілейны каляндар 2005

**20 студзеня — 100** гадоў таму (1905) — Нарадзіўся Ян Пятроўскі, беларускі рэлігійны дзеяч, літаратар, выдавец, эмігрант (Нямеччына, Аўстрыя, ЗША).

**20 студзеня — 50** гадоў таму (1955) — Памёр Лукаш Дзекуць-Малей, беларускі грамадскі і рэлігійны дзеяч.

**22 студзеня — 115** гадоў таму (1890) — Нарадзіўся Ільдафонс Бобіч, беларускі рымска-каталіцкі святар, выдавец.

**26 студзеня — 15** гадоў таму (1990) — Беларуская мова была абвешчана ў Беларусі адзінай дзяржаўнай.

**4 лютага — 490** гадоў таму (1515) — Нарадзіўся Мікалай Радзівіл Чорны, дзяржаўны дзеяч ВКЛ.

**16 лютага — 110** гадоў таму (1895) — Нарадзіўся Францішак Кушаль (памёр у траўні 1968), дзеяч беларускага вызвольнага руху.

**19 лютага — 115** гадоў таму (1890) — Нарадзіўся Казімір Сваяк (сапр. Канстанцін Стаповіч), беларускі каталіцкі святар, паэт.

**21 лютага — 100** гадоў таму (1905) — Нарадзіўся Філафей (сапр. Уладзімір Нарко), беларускі праваслаўны царкоўны дзеяч.

**24 лютага — 70** гадоў таму (1935) — Нарадзіўся Рыгор Барадулін, народны паэт Беларусі.

**29 лютага — 165** гадоў таму (1840) — Нарадзіўся Раман Рагінскі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 г.

**2 сакавіка — 75** гадоў таму (1930) — Нарадзіўся Сяргей Кавалёў, антысавецкі дысідэнт, праваабаронец, вязень сумлення.

**4 сакавіка — 115** гадоў таму (1890) — Нарадзіўся Вінцук Адважны (сапр. Язэп Германовіч), беларускі каталіцкі святар, пісьменнік, паэт.

**7 сакавіка — 20** гадоў таму (1985) — Віцебскі абласны суд асудзіў паводле артыкула „антысавецкая прапаганда і агітацыя” Міхася Кукабаку да пазбаўлення волі тэрмінам на 6 гадоў.

**8 сакавіка — 95** гадоў таму (1910) — Нарадзіўся Пётр Конюх, беларускі спявак, дзеяч эміграцыі (Італія, Бельгія, ЗША, Канада).

**13 сакавіка — 115** гадоў таму (1890) — Нарадзіўся Аляксандар Савіч, беларускі гісторык, апалагет беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы.

**14 сакавіка — 75** гадоў таму (1930) — У Вільні на канферэнцыі, склíканай таварыствам „Прасьвета”, быў утвораны Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт — грамадская рэлігійная арганізацыя ў Заходняй Беларусі.

**19 сакавіка — 110** гадоў таму (1895) — Нарадзіўся Тамаш Грыб, беларускі палітычны і культурны дзеяч.

**21 сакавіка — 165** гадоў таму (1840) — Нарадзіўся Францішак Багушэвіч, беларускі паэт, празаік, публіцыст, удзельнік паўстання 1863 г.

**23 сакавіка — 110** гадоў таму (1895) — Нарадзіўся Васіль Сташэўскі, беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання.

**25 сакавіка — 100** гадоў таму (1905) — Нарадзіўся Браніслаў Ржэўскі, беларускі літаратуразнавец, педагог, дысідэнт, палітычны вязень.

**25 сакавіка — 100** гадоў таму (1905) — Нарадзіўся Алесь Вечар, беларускі біяхімік, паэт.

(працяг будзе)

**(ух)**

*Ян Пятроўскі: Школа беларускае мовы — гэта школа адноснa даўгалетняга майго жыцця. Першым і найлепшым маім прафесарам гэтае мовы была мая добрая маці...*

# Любіў Беларусь і філасофію

Вядомы беларускі эміграцыйны празаік, перакладчык, мемуарыст і выдавец Ян Пятроўскі да свайго 100-годдзя не дажыў тры гады. Гэты юбілей літаратурная Беларусь адзначыць 20 студзеня 2005 года. У метрычнай кнізе Слуцкага сабора за 1905 год, копію якой усё жыццё захоўваў у асабістым архіве Ян Пятроўскі, у першай частцы адносна народжаных пад № 17 мужчынскага полу, ёсць наступны запіс: „Студзеня 7 дня 1905 года (па старым стылі) у мешчаніна места Слуцка Дзям'яна — сына Адама Пятроўскага і ягонае праўнае жонкі Юстыны — дачкі Андрэя, абодвух праваслаўнага веравызнання, нарадзіўся і 7 студзеня 1905 года ахрышчаны сын Ян. Хрышчонымі бацькамі былі мяшчане места Слуцка: Ян — сын Сымона Гурскі і панна Галена — дачка Мікалая Андрусевіча".



Бацька рана памёр, таму гаспадыняй у доме была маці, дапамагаў ёй старэйшы брат Апанас. Акрамя яго ў сям'і Пятроўскіх было яшчэ сямёра дзяцей.

Вучобу Ян Пятроўскі пачаў у хатняй настаўніцы. Пасля вучыўся ў школе Свята-Троіцкага манастыра, а потым — у прыхадской школе. У 1919 годзе сям'я Пятроўскіх пераехала ў Вільню. Там Ян закончыў гімназію і адбыў службу ў польскай арміі. Атрымліваў веды ён яшчэ на адукацыйных падрыхтоўчых курсах, пасля ў школе падхарунжых. Была ў яго яшчэ адна найважнейшая школа — гэта школа роднай мовы. У сваёй невялікай аўтабіяграфічнай кніжачцы „На васьмідзесятых ўгодкі" (Гэйнсвіл, ЗША, 1985 г.) Ян Пятроўскі напісаў: „Школа беларускае мовы — гэта школа адносна даўгалетняга майго жыцця. Першым і найлепшым маім прафесарам гэтае мовы была мая добрая маці гаспадыня Юстына Пятроўская. Пасля яе ішлі прафесары Р. Астроўскі са сваім правапісам беларускае мовы і Б. Тарашкевіч з беларускаю граматыкай". У 1931 годзе Ян Пятроўскі пераехаў з Вільні ў Варшаву і паступіў вучыцца ў пратэстанцкую Біблейскую школу ў Клярысаве. Пасля яе заканчэння працаваў год у Варшаве, а пасля пераехаў у Дзярэчын на Зэльвеншчыну. Тут ён за чатыры гады яшчэ бліжэй далучыўся сэрцам і душою да свайго народа, кожны дзень чуў родную мову і беларускія песні. Перыяд жыцця Яна Пятроўскага ў Дзярэчыне добра апісаў у сваёй кнізе „Дзярэчынскі дыярыюш" (Мінск 1999, с. 121-123) Міхась Скобла: „У 1932 годзе ў Дзярэчын на службу прыехаў дваццацісямігадовы мэтадыст эвангелічнай царквы Ян Пятроўскі. Наняўшы кватэру ў местачкоўца Гурыноўскага, ён энергічна ўзяўся за працу. Такім чынам, Божае слова гучала ў Дзярэчыне з вуснаў ксяндза Пачабута, праваслаўнага святара і прапаведніка-эвангеліста...

Ян Пятроўскі ў Дзярэчыне прапаведаваў не толькі Хрыстовае вучэнне. Ён шукаў падпісчыкаў на беларускую перыёдыку, стварыў у мястэчку суполку Таварыства беларускае школы...

Прапаведніку ад Бога, энцыклапедысту паводле абсягу ведаў, паліглоту Яну Пятроўскаму бракавала ў мястэчку суразмоўцы, з якім можна было б пагутарыць на разнастайныя тэмы. Часам ён выбіраўся ў Слонім да Гальяша Леўчыка. Яны плавалі ў чоўне па Шчары, аглядалі гістарычныя камяніцы старога горада, вялі бясконцыя размовы пра беларушчыну".

Сапраўды, Ян Пятроўскі шчыра сябраваў з беларускім паэтам, музыкантам, мастаком і калекцыянерам са Слоніма Гальяшом Леўчыкам (Ільёй Міхайлавічам Ляўковічам). Даследуючы творчасць Гальяша Леўчыка, я аднойчы напісаў пісьмо Яну Пятроўскаму ў ЗША, каб ён прыслаў успаміны пра вядомага слонімца. Спадар Пятроўскі вельмі ўзрадаваўся майму пісьму са Слоніма. Менавіта Гальяш Леўчык і стаў прычынаю нашага шматгадовага сяброўства. Мы перапісваліся. А ў 1992 годзе Ян Пятроўскі запрасіў мяне да сябе ў госці ў горад Гэйнсвіл у штаце Фларыда. Тады амерыканская амбасада была яшчэ ў Маскве. І калі я паехаў у белакаменную па візу, супрацоўніца амерыканскага пасольства сказала, што я — патэнцыяльны эмігрант і візы не адкрыла. Не дапамагло нават тое, што Пятроўскі мне купіў білеты туды і назад, і я іх ужо трымаў у руках.

Ян Пятроўскі ніяк не мог зразумець, чаму амерыканцы не пусцілі мяне ў ЗША. Тады ён пазваніў, а пасля неяк напісаў, каб я ў Слоніме наглядзеў добры дом, які можна было б купіць. Ён хацеў у горадзе над Шчарай адкрыць сваю бібліятэку і архіў, перадаўшы з Амерыкі ўвесь свой літаратурны скарб, а таксама трымаць і фінансаваць невялічкі штат супрацоўнікаў. І каб гэтай бібліятэкаю бясплатна карысталіся ўсе беларусы. Мне такі будынак удалося знайсці, але ажыццявіць планы спадара Пятроўскага не ўдалося. Па-першае, здароўе нашага суайчынніка з кожным днём пагаршалася, тым больш, што ён вельмі перажываў за раптоўную смерць і страту свайго 50-гадовага сына, а таксама любай жонкі Аліцыі. Па-другое, нехта з беларускага пасольства ў ЗША пачаў часта наведваць Пятроўскага і кантраляваць нашу перапіску, таму што многія лісты адзін да аднаго мы ўжо не атрымлівалі.

Цяпер вернемся да Гальяша Леўчыка, з якім шчыра сябраваў Ян Пятроўскі. Ян Дзям'янавіч прыслаў мне шмат цікавых, раней невядомых звестак пра земляка. Усе пісьмы Яна Пятроўскага захоўваюцца ў маім хатнім архіве. У адным з іх ад 15 кастрычніка 1993 года ён піша: „У часе мае першае сустрэчы з Гальяшом Леўчыкам, ён пяяў мне пад гітару жартаўлівую песеньку, з якое засталася ў памяці маёй адна страфа, у якой Язэпка расказвае пра сябе:

*Як падрос я крышку,*
*У школу стаў хадзіць,*
*І настаўнік у школе часта мне казаў:*
*У цябе, Язэпка, разумна галава,*
*Толькі ў Язэпкі розуму няма.*

Цікавыя ўспаміны пра Гальяша Леўчыка пакінуў Ян Пятроўскі ў першым томе сваіх трохтомных „Мэмуараў" (Гэйнсвіл, ЗША, 1988-1996 гг.). Ёсць там і каштоўныя ўспаміны пра „Дзярэчын — малы Версаль". Наогул, „Мэмуары" Яна Пятроўскага ахопліваюць усё XX стагоддзе, дзе аўтар апісвае і ўспамінае даваенныя Слуцк, Вільню, Варшаву, распавядае пра Антона Луцкевіча, пра беларускае жыццё на эміграцыі, пра гісторыю касцёла метадыстаў, а таксама пра Беларускі харытатыўна-адукацыйны фонд, які стварылі Ян і Аліцыя Пятроўскія. Гэты фонд шмат зрабіў для развіцця беларускай культуры ў свеце.

Да пачатку другой сусветнай вайны Ян Пятроўскі быў абраны сакратаром Гадавой канферэнцыі на XVI Місійнай канферэнцыі Паўднёвай епіскапальнай Метадысцкай царквы ў Польшчы. А ў 1939 годзе ў Капенгагене ён прымаў удзел у пасяджэнні з нагоды аб'яднання Метадысцкай царквы.

Калі пачалася вайна Ян Пятроўскі з сям'ёй жыў у Вільні, а пасля ў Берліне, дзе на беларускай мове выдаў „Новы запавет", а таксама нямецка-беларускі слоўнік. У 1946 годзе ў Аўстрыі выйшлі з друку дзве часткі яго англійска-беларускага і беларуска-англійскага слоўнікаў. А ў 1993 годзе гэтыя слоўнікі пабачылі свет у Мінску ў незалежнай выдавецкай кампаніі „Тэхналогія". У той жа Аўстрыі спадар Пятроўскі выдае яшчэ дзве паштоўкі. Адна з іх прысвечана Францыску Скарыну, а другая — Дню 25-га Сакавіка.

У 1953 годзе Пятроўскія эмігруюць у ЗША, дзе і пачынаецца іх шырокая, плённая творчая і выдавецкая справа. Ян Пятроўскі ўпершыню ў сусветнай беларусістыцы перакладае і выдае на беларускай мове дыялогі грэчаскага філасофа Платона. У шасці асобных кнігах выйшлі з друку дыялогі „Абарона Сакратаса", „Крытон", „Файтон", „Сімпазіён", „Іён", „Горгіяс", „Протагорас", „Гіппіяс вялікшы", „Парменідас" і „Політэя". Па-беларуску выходзяць і філасофскія роздумы рымскага імператара Марка Аўрэліюса.

У 1987 годзе асобным выданнем выйшла з друку даследчая праца Яна Пятроўскага „Старажытная грэцкая клясыка". А праз два гады праца нямецкага філосафа Карла Вільгельма фон Гумбольдта „Унутраная форма мовы", якую пераклаў на беларускую мову Ян Пятроўскі.

Не кожная дзяржава можа пахваліцца выданнем, якое маюць сёння беларусы — двухтомны „Грэцка-беларускі слоўнік" Я. Пятроўскага.

Сабраў наш суайчыннік і выдаў у ЗША трохтомнік „Лепшых думак чалавека", а таксама іншыя літаратурна-перакладчыцкія працы.

А яшчэ Ян Пятроўскі з 1962 да 1966 года выдаваў рэлігійна-метадысцкі часопіс „Светач Хрыстовае навукі" (выйшла ўсяго 24 нумары). А яго Харытатыўна-адукацыйны фонд меў яшчэ свой бюлетэнь „Анаграмы", дзе інфармавалася пра дзейнасць і сутнасць фонду, пра яго мэты, задачы і пра тое, што рабілася супрацоўнікамі фонду.

Вось такім быў і застаўся ў гісторыі беларускай культуры і літаратуры беларус Ян Пятроўскі. Ён добра ведаў старажытную грэчаскую, польскую, англійскую, нямецкую, рускую, украінскую, чэшскую, лацінскую і вядома ж сваю родную беларускую мовы. Філосаф Платон у дыялогу „Горгіяс" казаў: „Найгоршае на свеце зло — гэта тварыць несправядлівасць, бо толькі несправядлівыя з'яўляюцца няшчаснымі". А Ян Пятроўскі ад сябе дадае: „Я ніколі ў жыцці нікога не крыўдзіў, ды і не меў мэты каго-небудзь пакрыўдзіць". Ян Пятроўскі ўсё жыццё пісаў і выдаваў па-беларуску кнігі, ён моцна любіў антычную філасофію і сваю Бацькаўшчыну.

Сяргей Чыгрын

*Каб зразумець беларускую душу, варта не проста пазнаёміцца з нацыянальнай літаратурай, а таксама хаця б крыху прасачыць за яе гістарычным развіццём...*

# www.khblit.narod.ru

Беларуская літаратура існуе ўжо не адно стагоддзе. Яе вывучаюць, аб ёй спрачаюцца. Для многіх яна становіцца нібыта ключом, які адкрывае таямніцы душы беларуса. А беларуская душа справа далікатная і для таго, каб зразумець яе, варта не проста пазнаёміцца з нацыянальнай літаратурай, а таксама хаця б крыху прасачыць за яе гістарычным развіццём. Цяпер гэта не так цяжка, бо ў Інтэрнэце з'явіўся сайт Кафедры гісторыі беларускай літаратуры Белдзяржуніверсітэта.

Пад назвай сайта месціцца эмблема гісторыкаў беларускай літаратуры, выхады на іншыя рубрыкі і анатацыя, у якой, між іншым, распавядаецца пра гісторыю стварэння кафедры і падаецца кароткая інфармацыя пра змест амаль кожнай рубрыкі сайта.

Рубрыка „Пра кафедру” распавядае пра гісторыю беларускай літаратуры, пачатак і развіццё гэтай навукі. Вось што пішуць вучоныя: „Гісторыю беларускае літаратуры больш-менш сістэматычна пачалі вывучаць толькі ў XX стагоддзі… Нашаніўскае Адраджэнне і ўзнікненне беларускае дзяржаўнасці — БНР (1918) і БССР (1919) — спрыялі стварэнню ўласнабеларускае літаратурнае канцэпцыі. З самага пачатку гэтая канцэпцыя патэнцыяльна мела два адрозныя шляхі развіцця. Першы шлях рэпрэзентаваў М. Янчук, які рабіў акцэнт на канкрэтна-гістарычным падыходзе: неабходна браць пад увагу ўмовы гістарычнага развіцця народа”. Другі, згодна пададзенага тэксту, украінены ў рэшце рэшт У. Ігнатоўскім, грунтаваўся на мове твораў. На старонцы размешчаны таксама фотаздымкі працаўнікоў кафедры і магчымасці выйсця да іх персанальных рубрык.

У „Працах кафедры” падаецца вялікі збор разнастайных навуковых артыкулаў, напісаных навукоўцамі па згаданай тэматыцы. Сярод іх — „Тэматыка і праблематыка польскамоўнае творчасці Плакіда Янкоўскага”, „Евангелле ад Мацея”, або Таямніцы творчасці Францішка Багушэвіча”, „Хрысціянскі свет у творчасці Грыгора Цамблака” і многае іншае. Даная рубрыка будзе вельмі карыснай тым студэнтам, якія вывучаюць беларускую літаратуру.

„Семінар” — гэта своеасаблівая праграма навучання на кафедры. Надрукаваны нават пералік дзяржаўных экзаменаў для студэнтаў дзённага аддзялення, з чаго можна лёгка даведацца, што менавіта выкладаецца на кафедры гісторыі беларускай літаратуры.

„Бібліятэка” мусіць змяшчаць асноўныя творы па літаратуры ў тым ці іншым стагоддзі. Мусіць, але не змяшчае. Рэальна даюць поўную інфармацыю падрубрыкі, якія тычацца 18-га і 19-га стагоддзяў. У 17 месяцца толькі вершы Сімяона Полацкага, а 16 увогуле не адкрываецца.

Рубрыка „Каляндар”, гэта, па сутнасці, рубрыка датаў нараджэння ці смерці знакамітых беларускіх літаратараў і не толькі.

Астатнія старонкі маюць непасрэднае дачыненне да кафедры. Гэта, у першую чаргу, „Навіны кафедры” і „Выданні кафедры”. Старонка „Навіны літаратуразнаўства” можа быць цікавай шырокай публіцы — тут месцяцца такія выданні як „Польска-беларускі слоўнік”, што пабачыў свет у адышоўшым годзе і змяшчае ў сабе звыш 40 000 слоў і выразаў. Не менш цікавымі падаюцца кнігі „Старабеларуская літаратура 11-18 стст.” і „Старажытная літаратура ўсходніх славян 11-13 стст.”.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Першыя касцяныя канькі часу 12 стагоддзя на тэрыторыі Беларусі выяўлены археолагамі ў старажытным Полацку...*

# Беларусь, беларусы...

### Лыжы і канькі сярэдняй рукі

Зіма ўбіраецца ў сілу, а спартовы сезон па зімовых відах набірае разгон. У мінулых нумарах было расказана пра становішча спраў у беларускіх хакеі і біятлоне. Зараз — пра дасягненні айчынных канькабежцаў і лыжнікаў.

Першыя касцяныя канькі часу 12 стагоддзя на тэрыторыі Беларусі выяўлены археолагамі ў старажытным Полацку. Пазней, у 14-15 стст. яны былі драўлянымі, а з канца 17 ст. сталі выробляць металічныя палазы. Заканадаўцамі моды тут былі скандынавы. Так бегавыя канькі, на якія падобныя і сучасныя, сканструявалі нарвежцы ў канцы 19 ст. Чэмпіянаты Беларусі па простых каньках сталі праводзіцца з 1933 года, крыху пазней пачалі праводзіць турніры ўжо на бегавых. Асаблівых умоў для развіцця канькабежнага спорту не было, ды і няма. У часы СССР усе моцныя майстры шостай часткі сушы планеты трэніраваліся на славутым казахстанскім Медэа, што быў збудаваны на высакагор'і.

У 1964 г. першы беларус выступіў на зімовай алімпіядзе — у аўстрыйскім Інсбруку, выступаючы за СССР, Эдуард Матусевіч заняў высокае 6-е месца. Найбольшы поспех айчынных канькабежцаў у гісторыі — гэта срэбны медаль Ігара Жалязоўскага на белай алімпіядзе ў нарвежскім Лілехамеры. 18 лютага 1994 года ў яго гонар быў узняты бел-чырвона-белы сцяг. Гэта была першая ўзнагарода суверэннай Беларусі на зімовых алімпіядах. Жалязоўскі, ураджэнец Оршы, быў мацнейшым у свеце на дыстанцыях 1 000 і 1 500 м. На яго рахунку залатыя медалі ажно шасці чэмпіянатаў свету (у перыяд 1985-1993 гг.), Кубак свету ў 1992/1993 г. у спрынтарскім шматбор'і, бронза алімпіяды 1988 года, а таксама рэкорды свету.

Пасля Жалязоўскага ў беларускіх каньках быў значны прабел. Але неўзабаве з'явілася постаць Анжалікі Кацюгі. Менавіта з ёй апошнія гады звязваюць усе надзеі беларускія аматары. Трэніруе Анжаліку яе муж, практычна ўсе трэніровачныя зборы праходзяць за мяжой. Новы сезон Кацюга пачала даволі паспяхова. У кітайскім Харбіне на этапе Кубка свету яна заваявала ажно тры медалі — золата (на дыстанцыі тысячы метраў) і два срэбры. У агульным заліку на розных дыстанцыях беларуска ідзе пакуль на 4-м і 5-м месцах.

Лыжныя гонкі не асабліва папулярныя ў Беларусі, хаця нашы лыжнікі былі чэмпіёнамі СССР (В. Камоцкі, С. Сяргееў, Т. Маркашанская). Найвышэйшай заваёвай можна лічыць золата чэмпіянату свету 1966 года ў эстафеце Р. Ачкінай. Яна ж была бронзавым прызёрам алімпіяды ў Грэнобль у 1968 г. За апошнія дзесяць гадоў найбольш важкім было срэбра, заваяванае квартэтам нашых лыжнікаў (Я. Амосенка, С. Далідовіч, М. Семяняка, А. Трагубаў) у эстафеце на універсіядзе 1999 г. У сапраўды класнага майстра пацягам астатняга часу вырас толькі Сяргей Далідовіч, які здольны папсаваць нервы прызнаным фаварытам. Нядаўна ён пацвердзіў гэта, заняўшы на этапе Кубка свету чацвёртае месца. Важкасць лакальнаму дасягненню надае факт, што ўдзел у трыццацікіламетровай гонцы ўзяло ажно сто мацнейшых лыжнікаў свету. У агульным жа заліку Далідовіч пакуль толькі на 34-м месцы. Іншыя нашы лыжнікі ў табліцы знаходзяцца намнога ніжэй.

Так што цяпер у Беларусі лыжы і канькі сярэдняй рукі. Таму на алімпіядзе 2006 года ў Турыне асноўныя спадзевы на фрыстайлістаў і біятланістаў.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

## Каханне кантрабандыста

*Першым прапанаваў сустрэць Новы год сем'ямі Віталік Клімовіч. Маўляў, мы, кантрабандысты, добра ведаем кожны кожнага. Работа такая. Час ад часу патрабуе супольных высілкаў ды абмену інфармацыяй. Дапамагаем адзін другому, падстрахоўваем. Амаль радня. А вось сем'ямі так ніколі і не збіраліся. Паколькі ўся нашая тусоўка была ўжо някепска пад шафэ, то прысутным ідэя спадабалася. У такім стане кожная ідэя падабаецца. Неяк, напіўшыся, нават падтрымалі аднагалосна прапанову вылучэння са сваіх колаў кандыдатуру на пасаду прэзідэнта. Каб той легалізаваў кантрабандную дзейнасць і плацілі нам пенсію, за нашую цяжкую працу, як састарэем. Тады, пра гэтую добрую ідэю як праспаліся, так і забыліся. На гэты раз знайшліся супрацоўнікі адразу.*

*— А як быць з нежанатымі? — паставіў у тупік усю кампанію Юрка. — З кім яны прыйдуць?*

*— У нас халасцяк толькі Валерка Загорскі, — паспрабаваў знайсці выйсце з тупіковай сітуацыі Янка. — Можа ён да Новага года ажэніцца? Ну, дзеля нас. Яшчэ амаль тыдзень застаўся. Паспее як захоча. Прызнавайся, Валерка, маеш якую лярву. Як не, то падкінем пару-другую на выбар. І ўвогуле, ці кахаў ты калі-небудзь? Прызнавайся. Цябе, такога моцнага двухметровага бугая наўрад ці каханнем праб'еш.*

*— Давай, расказвай, — загаласіла п'яная кампанія. Гэта як людзі выпіваюць у цёплай хаце, то ўсе гавораць, а ніхто не слухае. А як зімой, у лесе, у чужой краіне, ды яшчэ з багажом кантрабанднага тавару, то ўсё наадварот. Хочацца паслухаць.*

*Валерка спахмурнеў. Сеў бліжэй да вогнішча, выпіў шклянку спірту. Закурыў. У заснежаным начным лесе стаяла ціш, як у куратніку без пеўня. Толькі вогнішча зрэдку патрэсквала.*

*— Жаніцца я, хлопцы, не буду. Нават дзеля вас, — распачаў свой аповед Загорскі. — А што да кахання, то аднойчы было. Тут няважна, двухметровага ты росту, ці метр з шапкай на абцасах у скачку. На тонкі доўгі жаночы волас слана зláвіць можна, не тое што чалавека. Так быў моцна закаханы, што больш ужо не паўторыцца. Памятаеце, як пераход на „Бабры” пасля рамонту адчынілі? Вырашыў я тады паглядзець, можа там справы лепш пойдуць. А то на нашым пераходзе мяне ўжо кожны сабака ведае. Паехаў я туды. Наладзіў сувязі з мясцовымі кантрабандыстамі. Даведаўся ўсё як мае быць. І каб аддзячыць хлопцам, якія мяне інструктавалі, вырашыў для іх закаціць баль у Свіслачы. Гулялі мы добра. А пасля мяне як чорт штурхануў. Пайшлі, кажу, куды на танцы. Тут якраз высветлілася, што непадалёку вяселле спраўляюць. Мы туды і пасунуліся. А там яна. Прыгожая такая. Ніколі не забудуся. А паходка — не ідзе, а піша. Правай нагой піша, а левай закрэслівае. Так хораша хадзіла. Закахаўся адразу. Ды і яна мяне ўвагай не абдзяляла. Я ад такога шчасця нават не заўважыў, што хлопцы на мяне неяк коса глядзець сталі. Дзе там тады было да хлопцаў. Душа спявала. Нарэшце я парадую сваіх старых бацькоў, паказаўшы ім Лену. А то ўжо даўно мяне душылі. Жаніся, кажуць, аглобля ты доўгая. У каго толькі пайшоў, прыдурак. Рабіць не хочаш. Толькі па замежжах катаешся. А бульбу капаць няма каму. Можа, як ажэнішся, паразумнееш.*

*Што са старых возьмеш? Прывыклі з баразны не вылазіць. І хочуць каб я так жыў. А ў мяне душа лятаць просіцца. Ну добра, не пра гэта зараз. Абрадую, думаю, старых. На такой прыгажуні ажанюся. На яе не тое, што мужыкі, сабакі аглядваліся як ішла па вуліцы. Я нават думаў, што як прапаную выйсці за мяне, адмовіцца. Але ж не. Узрадавалася, цешылася, прызналася ў каханні. Я такой мілай, бяскрыўднай, добрай істоты на свеце не бачыў. Здавалася, гэтае бездапаможнае дзяўчо мухі не зможа скрыўдзіць.*

*Бацькі мае, як убачылі Лену, палюбілі яе нават больш чым мяне. Усё казалі, што цяжка ёй будзе са мной. Надта ж яна слабенькая і падатлівая. Не хапае ёй злосці. Замяккая. А я шалеў ад гэтага імгненнага ўзаемнага кахання з першага позірку. Знаёмыя менш тыдня, а ўжо пра вяселле думаем. Жыць не можам адзін без другога. Я нават нічога пра яе не спытаў. Ні дзе жыве, ні дзе працуе. Стан быў такі. Цэлы тыдзень нерэальнага ўспрымання свету.*

*Неяк у панядзелак яна сказала, што ў яе скончыўся адпачынак і трэба ісці на працу. Я таксама падумаў, што пара зарабляць грошы на вяселле, наладаваў машыну спіртам і рушыў за мяжу. Ужо перад памежным пастом зразумеў, што дзень будзе няўдалы. Кантрабандысты, з якімі я нядаўна пазнаёміўся, не тое што гаварыць — вітацца са мной не хацелі. Адзін толькі праз зубы са злосцю вымавіў, што я небяспечны чалавек і здраднік. Прыехаў, маўляў, і ўлез у давер да ўсіх. І да кантрабандыстаў, і да мытні. Я нічога не мог зразумець, пакуль не ўбачыў Лену. Яна была апранутая ў мундзір супрацоўніка мытні і правярала машыны. Куды толькі падзелася такая мілая майму сэрцу лагоднасць. Голас яе быў рэзкі, каманды кароткія. У маіх вушах і зараз гучыць, як яна размаўляла з людзьмі: „Адкінь сядушку, раскруці дзверы, што вязеш, не прапушчу, машыну на яму!”. Гэта было нешта жахлівае. Я ўбачыў зусім іншую жанчыну. Агрэсіўную, бязлітасную, жорсткую. Раскіраваўшы машыну, я кінуўся да хлопцаў.*

*— Што ж вы не папярэдзілі? — пытаю.*

*— А ты не ведаў? Гэтая сцерва ў нас ужо не першую машыну сканфіскавала. А хабар як бярэ. Толькі давай. А ты нас кінуў і да яе. Выбірай, Валерка, кім ты будзеш заўтра. Ці паважаным усімі людзьмі кантрабандыстам, ці мужам гэтай.*

*Так скончылася маё каханне. Я доўга не думаў. Развязаўся адразу. Вось і сяджу зараз з вамі ў халадзе. Але не шкадую. У нашым жыцці свой смак.*

*Валерка змоўк. Толькі Янка парушыў цішыню:*

*— Ведаеце што, хлопцы. Адсвяткуем Новы год самі, без жонак. Так будзе лепш.*

***Сымон Нальшанскі***



Вачыма Міры

# *Гражына без зямлі*

*З Гражынай Б. можна сустрэцца ў клубе пенсіянера ў Беластоку, дзе яе добра ведаюць даўно, хоць толькі ўвайшла ў пенсійны ўзрост. Спявае там у гурце. Але пенсіі яна не атрымлівае. „Не належыцца”. Пакінула працу пасля групавых звальненняў. Новай працы ёй не знайсці, кажуць, застарая ў 55 гадоў. Занялася непасрэдным гандлем у фірме „Zepter”. Там, як находзішся за кліентамі, пераканаеш іх да куплі вырабаў гэтай фірмы, не такіх і танных, дык і заробіш. Справа добрая для маладых і здаровых, і такіх, што не баяцца рызыкі, што раптам пойдзеш з торбамі. Тады і твая сям'я „бэкне”, муж ці жонка, бо абавязвае маёмасная супольнасць. Гражына абарочвала вялікімі сумамі, брала і прадавала шмат тавару, дык дамовіліся з мужам, што пойдуць у сепарацыю. Гэта на выпадак фінансавага правалу. Жылі яны далей разам. Дзеці пайшлі ў свет, былі на сваім, а адкуль яны грошы мелі, бацькоў не цікавіла. Жылі небагата. Гражына і не ведала, што праз мужаў рахунак праходзіла „адмыванне грошай” двух сыноў, якія вялі падазроныя інтарэсы. Дарэчы, Гражына звыклася з тым, што з сям'ёй найлепш выходзіцца толькі на здымку. Навучыла яе гэтага ўжо маці, Лідзія Х., якая, меўшы чатыры дамы, таксама і на Кляосіне, старэнькая ды паморшчаная як вялае яблычка, і не думала дзяліцца маёмасцю з раднёй. Нажыла, дык усё яе; ёй ніхто нічога дарам не даваў... Праўда, апісала на Гражыну 8 гектараў кляосінскіх пяскоў, якія можна пабіць на дзялянкі, але ўсё гэта было толькі на паперы. Дачка не магла распараджацца гэтай маёмасцю. І ўсё яшчэ не падабалася старой маці, што выйшла Гражына замуж за Вальдэмара Б., які, хоць з вельмі вядомай ды палітычна заслужанай сям'і, быў толькі санітарам у бальніцы.*

*Робіш, робіш, здароўе траціш. Аплачваеш складчыны, дык цябе лечаць. Злегла Гражына на пару тыдняў у хаце. У той час сама мелі вяртаць нейкія кампенсацыі. Пайшла ў сваё былое прадпрыемства — а там хвіліну раней быў муж, узяў тых пару тысяч, каб жонцы аддаць. Паказаў быў толькі пашпарт, там напісана, што жонка ў яго Гражына, з такім самым прозвішчам. Не пыталіся аб паўнамоцтва. Такое вядомае прозвішча, пэўна, ён з „гэтых самых”! Стала шукаць пасля мужа з грашыма Гражына, а ён зашыўся ў адным з цешчыных дамоў, разам з дачкой, казаў, што памагаць будзе ўнука выхоўваць. Гражына можа жыць адна, у іх жа ж сепарацыя. Пра грошы „нічога не ведаў”.*

*Праз два тыдні Гражыну паведамілі, што Вальдэмар памёр. Пераходзіў парог, спатыкнуўся, ударыўся галавой. Чатырохгадовы ўнучак пазваніў па скорую, але ў дыспетчарскай не паверылі. Пакуль вярнулася дачка з працы, бацька акалеў.*

*На пахаванні ў родавай мясціне Гражыніну маці прывіталі шэпты: чаму ж гэта бабця не памерла, халера яе не бярэ, а ён, такі малады і прыгожы. І на Гражыну вырачыліся дзеці: чаго сюды прыехала, калі з бацькам не жыла? Абедзве, Лідзія і Гражына, выйшлі адразу з касцёла. „Ці я табе не казала, каб не разлічвала на гэтую паганую сямейку? І ад мяне не чакай нічога!”*

*Ці можа атрымаць пенсію па памерлым мужу беспрацоўная Гражына Б.? Перш за ўсё пайшла яна ў загс атрымаць акт ягонай смерці. А там ужо раней былі іхныя дзеці, бралі акты, дзеля таго, каб атрымаць страхоўку, паведамілі, што прыйдзе па дакумент жанчына, якая не з'яўляецца жонкай іхнага бацькі і нельга ёй даваць бясплатныя акты. Апусціла кабета рукі. Сілай адправілі яе знаёмыя на юрыдычную кансультацыю. Вядомы беларускі юрыст растлумачыў ёй, што трэба аформіць, і што сепарацыя гэта не развод. Тым больш такая — чыста фармальная. Сведкамі супраць былі дачка і сын — у апошні час Вальдэмар Б. з жонкай не жыў. Забаранілі таксама выступаць ёй за спадчыну, якая ёй належалася б, тым больш, што маёмасць нажыло сужонства Б. разам за трыццаць гадоў супольнага жыцця. Справа датычыла б таксама ашчадных кніжак. Колькі гэтага ўсяго было, даведалася Гражына, калі банк прыслаў паведамленне аб стане ашчаднасцей мужа. Шпітальны санітар сабраў больш за пяцьсот тысяч злотых. Мабыць, гэта грошы, якіх не паспелі „адмыць” сыны, што ўплачвалі на ягоны рахунак частку сваіх здабыткаў. Сыны паінфармавалі Гражыну, што, калі будзе старацца хадайнічаць за тыя грошы, хутка і ціха трапіць туды, адкуль не вяртаюцца.*

*Тыдзень таму маці Гражыны атрымала за даччыныя гектары еўрасаюзную даплату. На ўласны банкаўскі рахунак.*

***Міра Лукша***

# Святочныя віншаванні

Латвійскае таварыства беларускай культуры „Сьвітанак” віншуе калектыў рэдакцыі і чытачоў тыднёвіка „Ніва”, а таксама ўсіх беларусаў у Польшчы з Новым годам, Нараджэньнем Хрыстовым і Калядамі! Зычым усім у 2005 годзе здароўя і дабрабыту, а таксама плёну ў справе захаваньня і адраджэньня роднай мовы, багатай культуры, нашых традыцый.

***Рада ЛТБК „Сьвітанак”***

Шаноўныя сябры рэдакцыі „Нівы”! Таварыства Беларускай Культуры ў Літве віншуе са сьв. Калядамі і Новым 2005 годам, і жадае Вам і Вашым блізкім добрага здароўя, сіл, энэргіі і посьпехаў у нашай агульнай справе змаганьня за свабоду і незалежнасьць нашай Бацькаўшчыны Беларусі.

***Хведар Нюнька***
***старшыня ТБК***

# Таінства Еўхарыстыі і малітвы

На спатканне з епіскапам Бельскім Грыгорыем, арганізаванае Праваслаўным брацтвам свсв. Кірылы і Мяфодзія ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, прыбыло многа вернікаў. Тэма сустрэчы — „Еўхарыстычнае жыццё праваслаўнага хрысціяніна” выклікала дыскусію пасля спаткання. У час размовы пра малітвы, якую правёў пазней дырэктар Інстытута праваслаўнай культуры ў Гайнаўцы протаіерэй Славамір Хвойка, прэзентаваліся практычныя ўказанні для вернікаў.

**Як найчасцей прыступаць да Святога Прычасця**

— Раней людзей, якія не прыступалі да таінства Еўхарыстыі ў час Літургій выключалі з Царквы. Святары, якія не прыступалі да Святога Прычасця, мусілі тлумачыцца, чаму так робяць. Мы павінны вярнуцца да вытокаў хрысціянства, — гаварыў епіскап Грыгорый і раіў як найчасцей прыступаць да таінства Еўхарыстыі.



Фота Аляксея Мароза

„Мне бацюшка сказаў, што грэшна часта прыступаць да Святога Прычасця”, — паўтарыў словы верніка епіскап і растлумачыў, што такі падыход не знаходзіць апраўдання ў царкоўных канонах. Гаварыў ён, што таінства Еўхарыстыі павінна быць папярэджана пакаяннем і споведдзю. Суровасць посту перад прыступаннем да Святога Прычасця павінна залежаць ад індывідуальнага духовага жыцця вернікаў.

— Што зрабіць, калі асоба, у якой я прашу прабачэння, не хоча мне прабачыць? Як ісці да Прычасця, калі сорамна выявіць некаторыя грахі? — пытала епіскапа жанчына.

Уладыка Грыгорый тлумачыў, што нельга саромецца гаварыць аб правінах у час споведзі. Засакрэчаныя грахі могуць нарабіць многа шкоды. Трэба таксама звяртацца да іншых асоб з просьбай прабачэння грахоў, незалежна ад іх адносін да нас.

— Мне вельмі падабаецца грэчаская споведзь, калі святар у вызначаных гадзінах прымае вернікаў. Размаўляе з імі і вырашае праблемы іх духовага жыцця. Калі вернікі ходзяць да аднаго святара, ён ведае іх правіны, жыццёвыя праблемы і можа ім дапамагчы пазбягаць грахоўных учынкаў, — сказаў уладыка Грыгорый.

**Не пакідаць малітваў**

Духовы апякун гайнаўскага праваслаўнага брацтва протаіерэй Славамір Хвойка раіў не пакідаць малітваў, якія з'яўляюцца „харчаваннем” для людскіх душ.

— Святы Феафан Затворнік гаварыў, што душа без малітвы душыцца і становіцца мёртвай. Малітва дае нам сілу, калі ідзе ад сэрца пакорлівага чалавека, — заявіў айцец Славамір. Гаварыў ён, што ў час малітваў нельга ўяўляць сабе ніякіх пастацей, а думкі засяроджваць на словах. Калі цяжка сачыць за малітвай, трэба зрабіць перапынак. Можна тады чытаць фрагменты Евангелля або кніг святых айцоў. Найлепш выдзеліць раніцай і вечарам акрэслены час на малітвы і старацца трымацца сваіх рашэнняў. Пасля малітоўных прашэнняў добра было б дадаваць словы — „няхай будзе воля Твая, Божа”.

Протаіерэй Славамір раіў не шукаць спецыяльных малітваў, што чытаюцца ў розных патрэбах. Прапанаваў часта маліцца простымі і кароткімі малітвамі да Хрыста, Божай Маці і святых. Малітвы, сказы з Евангелля або багаслужбаў можна паўтараць у вольны час і выконваючы заняткі. Феафан Затворнік прапануе спачатку добра прааналізаваць малітвы, што будуць чытацца. У мінулым маліліся ўсе сямейкі супольна. Дзеткі прывучаліся да малітваў, назіраючы за дарослымі. Апошнім часам мала сямействаў моліцца супольна.

**Знаёмяцца з магіяй і варажэннем**

Протаіерэй Славамір Хвойка, адказваючы на пытанні, адмоўна ацаніў святкаванні ў гонар духаў, якія апошнім часам уводзяць настаўнікі англійскай мовы і варажбы ў час „Анджэйкаў”. Некаторыя вучні рашаюцца на варажэнне дома. Усё гэта выклікае адмоўнае ўздзеянне на псіхіку маладых людзей і іх захаванне. Некаторыя вучні могуць трапіць пад актыўнае ўздзеянне дэманаў (апантанне). З Захаду прыбыла канзумерская філасофія жыцця. Прадбачвае яна спадзявацца, у галоўным, на свае сілы і ўмеласці, што супярэчыць хрысціянскім указанням. Праваслаўныя вернікі павінны пераканацца ў сваёй бяссільнасці і жыць надзеяй на Божую дапамогу ва ўсіх абставінах. Раней у фільмах для дзяцей дабро перамагала над злом і таму былі яны маралізатарскімі. Апошнім часам у мульціках паказваюцца змаганні і войны. Моладзь многа часу сядзіць пры камп'ютэрах і карыстаецца іграмі, што вучаць агрэсіі.

Протаіерэй Славамір крытычна ацаніў папулярную сярод моладзі кніжку „Гары Потэр” і падобную да яе літаратуру, якую можна ўзяць у многіх школьных бібліятэках. Моладзь сутыкаецца ў гэтай літаратуры з магіяй. Кніжкі гэтыя выклікаюць у вучняў непаслушэнства ў адносінах да бацькоў і настаўнікаў.

**Аляксей Мароз**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 964 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2005 r. upływa 5 marca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# *„Даўціпы”*
## *Андрэя Гаўрылюка*

Гіпнатызёр у цырку паказвае аднаго гледача і інфармуе публіку:

— Цяпер загіпнатызую гэтага чалавека і загадаю яму забыць усе непрыемныя рэчы.

Пасля гэтага артыст кажа зноў:

— А цяпер загіпнатызую вось гэтага чалавека і загадаю яму забыць усе непрыемныя справы.

— Толькі не яго! — крычыць з трэцяга радка Янка. — Ён вінаваты мне васемсот злотаў.

* * *

— Што трэба зрабіць, каб спакойна заняцца альпінізмам?

— Напісаць тастамент.

* * *

Наведвальнік энергічнымі крокамі бяжыць у кабінет дырэктара; запыняе яго ахоўнік:

— Што вам трэба?

— Пабачыцца з дырэктарам!

— Гэта немагчыма: дырэктар спажывае снеданне і толькі сакратарка мае права яму перашкодзіць.

— У такім выпадку завядзіце мяне да сакратаркі.

— Гэта таксама немагчыма, бо і яна спажывае снеданне.

— Дык перарвіце ёй.

— І гэта немагчыма, бо сакратарцы НІХТО не мае права перашкаджаць.

* * *

Сям'я плыве на караблі. Раптам малы Янка пытае пагружанага ў чытанне газеты бацьку:

— Татка, ці магу зняць са сцяны выратавальны круг?

— Не: гэты круг вісіць на выпадак, калі б нехта выпаў за борт.

Праз хвіліну бацька цікавіцца:

— А навошта ты хацеў зняць той круг?

— Не хацеў я, татка, табе празмерна перашкаджаць, але наша мама выпала за борт.

* * *

Да ўласніка будаўнічай фірмы прыходзяць бацька з сынам — выпускніком прафтэхвучылішча, і пытае пра магчымасць прыняць нашчадка на працу. Шэф прапануе:

— Патрэбны нам памочнік.

— А колькі б ён зарабляў? — цікавіцца бацька.

— 1 200 злотаў.

— Гэта замнога; пойдзе куды з сябрамі ды прап'е.

— Мог бы ён тады быць намеснікам памочніка за 800 злотаў.

— Гэта таксама замнога. Ці няма ў вас нейкай горш аплачваемай працы?

— На жаль, ёсць яшчэ праца за 500 злотаў, але для яе трэба мець вышэйшую адукацыю.

* * *

Студэнт медыцыны гаворыць свайму сябру:

— Прыдумаў я навуковую работу на тэму „Уплыў паліцыі на паправу зроку”. Ідзя выспела, калі за мною ехала паліцэйская машына, а я дакладна прыглядаўся ўсім дарожным знакам.

* * *

Валя пытае сяброўку, якая нядаўна вярнулася з Лондана:

— Наведала ты можа Нацыянальную галерэю?

— Навошта? Хопіць мне, што мой сын штудзіруе жывапіс і дома я вымушана ўвесь час глядзець нейкія карціны.




# *Так мала*

*Здаецца, так мала пражыў,*
*Няма што расказаці,*
*А ўжо прыйшлося мне*
*Васьмідзесятку размяняці.*

*Праўнукаў я ўжо дачакаў,*
*Няхай жывуць здаровы.*
*Хацелася б яшчэ мне*
*Гуляць у іх на вяселлях.*

*І ў „Ніву” доўга я пісаў,*
*Каб людзі ўсё чыталі.*
*І яшчэ хочацца пісаць,*
*Толькі каб рукі не дрыжалі.*

*Яшчэ ўсяго я не зрабіў*
*Каб мяне ўсе ўспаміналі*
*Калі пайду ў адпачын*
*Пра мяне не забывалі.*

*Было мне цяжка на грудзях*
*Што трудна расказаці*
*Калі маё роднае дзіця*
*Прыйшлося ў вечнасць адпраўляці.*

*Чалавек усё стрывае*
*Хоць цяжар вялікі мае*
*Але няхай ніколі ён*
*Бога не забывае.*

*У Богу надзея ёсць*
*У Бога вялікая сіла*
*Маліцеся ўсе да Яго*
*То будзем жыць шчасліва.*

**Мікалай Лук'янюк**

# *Адгаданка*




1. напр. Карлавы Вары, Сочы, Спа, 2. час трывання нейкага працэсу, сезон, эпоха, 3. малюнак з агітацыйным тэкстам, афіша, 4. кінафільм, кінематаграфія, 5. смутак, журба, 6. сухія праснакі з пшанічнай мукі, якія выпякаліся яўрэямі на пасху, 7. магутнасць, трываласць, 8. вадаплаўная птушка з доўгай шыяй, 9. актывіст, 10. жыхар Самарканда, Бухары, 11. палітычная арганізацыя, напр рэспубліканская або дэмакратычная ў ЗША, 12. бульбаш яе варыць а ноч цэлу жарыць, 13. земляроб, які ідзе за плугам. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 46 нумара**

Штылет, ручнік, ярмо, чужына, рубель, Юпітэр, царыца, юбілей, консул, зяць, соль.

Рашэнне: **Белыя ручкі чужую працу любяць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Марціну Стоцкаму** з Дубіноў і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

# 2.01 – 8.01



**Баран (21.03. — 19.04.)** Марс дадасць табе адвагі, аптымізму. Пазбягай рызыкі. Не паддавайся хвілінным эмоцыям і не папракай іншых за тое, што табе не зрабілі. Падзейнічаеш з большым размахам і фантазіяй.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Кан'юнкцыя Венеры і Сатурна дазволіць табе заззяць як душы кампаніі. Пазнаёмішся з кімсьці, хто табе паможа ў кар'еры.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Знойдзеш радасць жыцця і будзеш шчаслівы. Надзвычайны поспех у іншага полу, знакаміты выгляд і радасць у душы.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Досыць нервовая атмасфера, прабуджэнне ў табе тугі, мараў і неспакою. Прыдаўся б давераны дарадчык, нават у час пакупак.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Знакамітыя ідэі і празорлівасць. Празмерныя амбіцыі і агрэсіўныя паводзіны. Справішся з усім, што назбіралася пры канцы года, хоць набрыдзе на цябе меланхолія.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Шмат нагод для карысных знаёмстваў. Можаш даць сабе волю ў пакупках, нават вялікіх ды экстравагантных. Сваркі ў пары могуць кончыцца раптоўным расстаннем.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** Будзеш цешыцца жыццём. Знакамітую забаву будзеш памятаць доўга! Выдатны настрой. Калі вы немаладыя Шалі, дык будзеце адчуваць, быццам памаладзелі на шмат гадоў.

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** Гойданка пачуццяў і настрояў ад лагоды да шалёнай рызыканцкай адвагі. Усё ж, з добрым фіналам. Сябры не будуць мець для цябе шмат часу, але можа ўдасца разам файна правесці час. Атрымаеш у падарунку штосьці, аб чым даўно марыў.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Час поруч каханай асобы. Стральцы з 23-27.11. надта сварлівыя ў адносінах да дзяцей. У новай кампаніі станеш узорам. Добры момант на пачатак шырокай дзейнасці. Паправа ў фінансах.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Непатрэбныя скрыгіты ў святочным настроі. Не дай вывесці сябе з раўнавагі. Інспірацыя да змен, што не ўсім спадабаецца. Аўтарытэт дома. Казярогі з трэцяй дэкады не павінны дазволіць, каб сям'я макала свае пальцы ў іх прафесійныя справы (хіба што маюць сямейную фірму).

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Радасны пачатак года, добры настрой, мілыя неспадзяванкі. Абмяжуй шаленствы і непатрэбную рызыку ў святы. Не выдавай грошай, нават калі „лёгка прыйшло, лёгка пайшло”.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Вялікая інтуіцыя; слухай яе падказак. Памятай, што тым, хто кахае, не заўсёды патрэбны словы. Найлепш удалыя святы ў камернай групе ці ўдваіх. Не дыскутуй зашмат аб палітыцы ці нават культуры, знаёмства перамяніцца хутчэй у штосьці іншае. Калі яшчэ раз даверыш асобе, якая не прызнаецца да сваіх памылак, зноў расчаруешся.

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960